Літаратурная Беларусь

Выпуск №7 (179)
(чэрвень)

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІ ПРАЕКТ
Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага Часу»

lit-bel.org
novychas.by

Змест

Ганна КОМАР: «Калі б ка́ты чыталі кніжкі, яны б не былі такімі»

Паэтка і перакладчыца Ганна Комар ма́е два вершаваныя зборнікі: беларускі «Страх вышыні» і англійскі «Recycled». А яшчэ яна адна з самых яркіх літаратарак пратэсту. У інтэрв'ю Ганне Варонка яна распавядае аб тым, як радавацца нават у цёмныя часы, пасябраваць са страхамі, а яшчэ пра кепскія анекдоты, добрыя вершы, экзістэнцыйную тугу ірландцаў і беларусаў ды пра фемінізм.

— Хочацца пачаць з чагосьці прыемнага… Што цябе радуе?

— Мяне радуюць натхнёныя людзі. Калі сустракаю чалавека з актыўнай грамадскай пазіцыяй, у якога гараць вочы, я ажываю. Радуюць мае ўласныя поспехі, вядома. Калі на тое, што ствараю, рэагуюць людзі. Радуе, калі атрымліваецца сябе любіць і паважаць, гэта вялікая праца. Калі выходжу на здаровае плата, дзе павага і любоў да сябе не вымучаныя, дзе і без штоімгненных нагадванняў памятаю, што нельга прыніжаць і ганьбіць сябе… Людзі радуюць. Але не ўсе (смяецца). Сваёй падтрымкаю, салідарнасцю. Радуе, калі мяне кормяць (смяецца). Мама і сястра, калі езджу да іх у Баранавічы, і адзін мой сябар. Узаемадапамога вельмі радуе. Калі кідаю які-небудзь запыт у сацыяльных сетках: знайсці чалавеку ноўтбук, які канфіскавалі, напрыклад. І камп'ютар хутка знаходзіцца. Радуе, калі я часам «забіваю» на ўсё і проста чытаю кнігу. Гэта неабходна, бо калі не адпачну, проста з'еду з глузду. Радуе, калі знаходжу ў сабе сілы не зазіраць у тэлефон, не сядзець у навінах, часам не рабіць працу і пры гэтым не адчуваць віну.

Яшчэ, дарэчы, вельмі цешыць, калі ад майго прыкладу людзі пераходзяць на беларускую мову. Як атрымліваецца: хтосьці адказвае пісьмова па-беларуску, хтосьці пачынае размаўляць штодня. Я перайшла на родную мову ў 2015 годзе. Але размаўляла не ўвесь час і не паўсюль. У грамадскіх месцах мне было цяжка гаварыць на беларускай. А цяпер наадварот. Гэта форма салідарнасці. Нядаўна пайшла ў атэлье, каб замяніць гузік на штанах. Майстрыха была такая радая: «Мне так прыемна, што вы размаўляеце па-беларуску!». Сказала, што ў дадзеных варунках, магчыма, гэта адзінае, чым мы можам падтрымаць адно аднаго.

— Якую, дарэчы, кнігу ты параіла б пачытаць людзям, якія знаходзяцца ў такім стане?

— Насамрэч кожнаму сваё. У мяне няма мэты прачытаць лёгкую кнігу. Апошняя — «Па што ідзеш, воўча?» Евы Вежнавец. Даволі цяжкі твор. Але вельмі важна не ўцякаць ад болю, а сустрэцца з ім твар у твар. І гэта, дарэчы, таксама радуе, калі атрымліваецца. Таму што тады ты робішся мацнейшай. Чытаеш тую кнігу і разумееш, што так, было шмат цёмных старонак у гісторыі нашай краіны: генацыд, рэпрэсіі, войны. І ад таго, што гэта ўсведамляю, я не раблюся слабейшай. Я ж не вырасла з ніадкуль, я вырасла з гэтай культуры. Значыць, яна становіцца глебай, дае энергію… Вядома, трэба параіць пачытаць вершы. Камусьці, можа, для разнастайнасці — пра каханне. Днямі залезла ў фотаздымкі свайго старога кахання. Проста каб пераключыцца (смяецца). Апошнім часам чытала вершы расійскага паэта Уладзіміра Каркунова, раю. Думаю, часопіс «Наша гісторыя» варта пачытаць — і настрой падымае, і адукоўвае.



Фота Ксеніі Свірыд

— Чытала твой зборнік «Страх вышыні». І знайшла там шмат блізкага, мабыць, мы выхоўваліся ў вельмі падобных умовах. Дык як змагацца са страхамі?

— Змагаюся дагэтуль. Але я перастала ўжо ставіць мэту іх перамагчы (задуменна). Калі зразумела, што страх і трывога — гэта не ворагі, яны выконваюць абарончую функцыю, ад чагосьці нас берагуць. Таму важна не перамагчы іх, а пасябраваць з імі.

— Пасябраваць са страхамі?

— Пасябраваць са страхамі (усміхаецца). Я калісьці прачытала такую псіхалагічную практыку «Пасябруй са сваім страхам». Там трэба было візуалізаваць страх як монстра і спытаць, чаго той хоча. Візуалізацыя цікава працуе, знаходзіцца нейкі ключ. І тады твой монстр пачынае расказваць: «Я хачу бяспекі, я хачу, каб мяне любілі, увагі. Я стаміўся». Гэта нашыя патрэбы, якія мы з розных прычынаў не прызнаем. А ты адказваеш монстру, напрыклад: «Давай я цябе абдыму». І гэта ўжо не страх, а сябра (смяецца). Напэўна, вершы — гэта таксама спроба пасябраваць са сваім болем. З непакоем, трывогаю, расчараваннем, чаканнямі, пачуццямі, якія хочацца адштурхнуць. Гэта я толькі што прыдумала (смяецца). Кніга «Страх вышыні» была прызнаннем праблемы, крок да яе рашэння: «Так, у мяне ёсць страхі, такія і такія раны». Кніжка, якую рыхтую цяпер, называецца «Трыпунік». Яна — ужо лекаванне ран. Раскалупала — цяпер будзем лекаваць.

— І хутка яна выйдзе?

— Ну… усе вершы ўжо гатовыя. Кніга рэдагаваная, карэктаваная, цяпер этап дызайна і вёрсткі. «Трыпутнік» — білінгва. Рэдактарка беларускай часткі — Вольга Гронская, а англійскай — амерыканская паэтка, мая сяброўка Мэры Колар. Але пакуль што пад пытаннем, калі кніга можа быць надрукаваная.

Адзін з урокаў, засвоеных апошнім часам — не трэба бегчы перад цягніком. Можна ехаць, глядзець у акно, а на сваім прыпынку выйсці. Дзякуючы маёй псіхатэрапеўтцы, вучуся (смяецца). Для ўсяго свой час. Я думаю, нашае грамадства цяпер на такім этапе, што гэтая кніга ўпала б у чорную дзірку. Магчыма. Каб яе прачытаць, патрэбны рэсурс. А на дадзеным этапе мы даволі раскіслыя. І гэтага рэсурсу проста няма. Дык навошта? Выдаць, каб выдаць? Ну, не. Яна ж жывая. Я сама, напэўна, не маю сілаў яе прачытаць цяпер. Так, «Трыпутнік» пра лекаванне, і яно б нам усім не зашкодзіла. Але і лекаванне не заўсёды праходзіць лёгка. Гэта ж можа быць і хіміятэрапія, і антыбіётыкі, і аперацыя, і швы. У свой час кніга будзе, я гэта ведаю…

— Сустракала нямала жанчынаў, якія недабразычліва ставяцца да феміністак. Што дзіўна, на мой погляд. Чаму гэта адбываецца, як думаеш?

— І я такой была, не нарадзілася ж феміністкай. А выхаванне атрымала і ўвогуле антыфемінісцкае. Нейкі час таму дыскутавала са старэйшай сястрой. Яна шчыра верыла, што жанчына павінна сядзець дома і займацца дзецьмі, а мужчына — зарабляць грошы. Я спрабавала давесці: «У цябе ўтылітарнае стаўленне да мужчыны, ён жа не інструмент, а такая ж жывая істота, як ты». Можа, у яго не атрымліваецца зарабляць гэтыя грошы, можа, ён не хоча. Таксама мае на гэта права. Яна, вядома, не пагаджалася. Не разумела, пра што я ўвогуле даводжу, думала, што сапраўды хоча так жыць. І вось з мінулага лета ў яе памянялася стаўленне, раптам зразумела, што ёй падабаецца быць незалежнай, развівацца, а не сядзець векі вечныя дома. Але займацца дзецьмі, хатняй гаспадаркай, менеджментам — таксама цяжкая праца.

— За савецкім часам чамусьці і праца, і гаспадарка паклаліся на плечы жанчын…

— Адзін з самых вялікіх падманаў савецкага часу. З аднаго боку, жанчынам далі эмансіпацыю: ты можаш дасягнуць усяго, займаць любыя пасады, кіраваць машынай, і ўсё на свеце. Але пры гэтым і гаспадарка, і дзеці ўсё роўна на табе. Мужчынам жа можна толькі працаваць. А цяпер збіраем плады, калі многія жанчыны мусяць браць на сябе ўвесь менеджмент. Трэба прыдумаць усё: што вы будзеце есці і як гэта прыгатаваць, куды трэба адвесці дзяцей і калі забраць, што купіць — усю лагістыку сямейнага жыцця.

Працяг на стар. 17 (12) »

«ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | № 7 (179) | 30 ліпеня 2021 | № 29 (737) Новы час

Іван Неслухоўскі — Янка Лучына

6 ліпеня — 170-я гадавіна з дня нараджэння аднаго з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры Янкі Лучыны.




ВЯЗАНКА.

Янки Лучыны

(Ивана Неслухоўскаго).

Пецербургъ.
1903 року.

Сыракомля і Дастаеўскі

Нарадзіўся Янка Лучына — так ён пачаў падпісваць сябе пад беларускімі творамі, а сапраўднае імя — Іван Неслухоўскі — у Менску ў 1851 годзе. Ён паходзіў са старажытнага беларускага шляхецкага роду Лучыўка-Неслухоўскіх (герба «Дамброва»), згадкі пра які адносяцца да XIII стагоддзя. Тады продак пісьменніка Пшэбыслаў Дамброва адзначыўся ў змаганні супраць татара-манголаў, за што атрымаў землі ад польскага князя Конрада Мазавецкага. Паводле адной з версій, на тых землях знаходзіўся маёнтак Неслухі, ад якога і пайшло прозвішча роду. Вядома, што многія пакаленні продкаў пісьменніка служылі, жылі і мелі землі ў ВКЛ. Прадзед — таксама Іван Неслухоўскі — служыў ротмістрам Навагрудскага ваяводства, а дзядуля — межавым суддзёй Слуцкага павета. Нягледзячы на тое, што род Неслухоўскіх меў вялікую гісторыю, у Расійскай імперыі дваранскае званне было зацверджанае толькі з другой спробы.

Бацька Янкі рабіў кар'еру на Міншчыне: служыў у мясцовым губернскім праўленні, дзе прайшоў шлях ад пісара да памочніка столаначальніка, потым сам стаў столаначальнікам Мінскай палаты цывільнага суда, а пазней атрымаў чын калежскага асэсара. У Мінску бацькі Янкі мелі ўласны дом, але таксама арандавалі ў Радзівілаў фальваркі Мархачоўшчына і Зацэржаў. Цікава, што раней фальваркам Мархачоўшчына валодаў бацька паэта Уладзіслава Сыракомлі (сімвалічна, бо сам Сыракомля быў для Янкі творчым настаўнікам, прыкладам). Не менш сімвалічна, што раней продкі паэта валодалі землямі, якія належалі продкам Фёдара Дастаеўскага.

Тыфліс, Максім Горкі і параліч

Першую адукацыю Янка атрымаў у прыватным пансіёне настаўніка Ціля, дзе навучэнцы жылі амаль увесь час і вярталіся да сям'і толькі ў выходныя і на святы. Потым хлопчык працягнуў навучанне ў Мінскай класічнай гімназіі, па сканчэнні якой паехаў у Пецярбург. Там ён паступіў і некаторы час вучыўся на матэматычным факультэце Пецярбургскага ўніверсітэта. Але праз год малады чалавек перадумаў і наноў паступіў у Дзяржаўны тэхналагічны інстытут на механічнае аддзяленне на модную ў тыя часы спецыяльнасць інжынера.

Пасля атрымання адукацыі Янка Лучына быў накіраваны на працу ў далёкі ад радзімы куток Расійскай імперыі — Тыфліс, дзе стаў начальнікам чыгуначных складоў. Там жа, на Каўказе, малады чалавек пазнаёміўся з Максімам Горкім. Але праца ў Тыфлісе аказалася нядоўгай. Праз некалькі гадоў па апошнім прыездзе ў Менск маладога чалавека напаткала страшная бяда. Аднойчы Янка ўпаў, і яго разбіў параліч. Уся ніжняя частка цела стала нерухомай, хадзіць ён мог толькі з дапамогай мыліц. Праз здарэнне ў Тыфліс ён ужо не вярнуўся, застаўся ў Менску.

Аднак страшэнная хвароба не зламала Янку Лучыну, ён застаўся жыццярадаснай і энергічнай асобай, працягваў жыць паўнавартасна і насычана. У прыватнасці, пра гэта сведчыць тое, што ён уладкаваўся на працу ў менскае тэхнічнае бюро Лібава-Роменскай чыгункі, наведваў тэатр, хадзіў на рыбалку і нават на паляванне. У той жа час існуюць і аргументаваныя версіі, нібыта малады чалавек сімуляваў хваробу, каб не вяртацца на Каўказ, а застацца на радзіме. У любым разе цяпер цяжка дакладна сказаць, якая версія сапраўдная.

Шматмоўны паэт

Першыя паэтычныя спробы Янкі Лучыны адносяцца яшчэ да дзевяцігадовага ўзросту, калі ён вучыўся ў пансіёне. А вось сапраўдны яго дэбют у друку адбыўся ў 1886 годзе ў газеце «Минский листок», а таксама ў польскім часопісе «Kłosy». Першыя творы Янкі Лучыны з'ўляліся на польскай і расійскай мове. Першы ж беларускамоўны твор быў надрукаваны ў 1889 годзе, і менавіта тады з'явіўся псеўданім паэта.

Цэнзурны гнёт прымушаў Янку Лучыну звяртацца да эзопаўскай мовы. Вясна, рунь у яго — сімвал абуджэння, а зіма, хмары, мароз — вобразнае выяўленне сіл, варожых народу:

Хоць бы раз без цябе зарунець бы палям,
Хоць бы раз у свой час адышла бы зіма.
Ўстрапянуўся бы дух ў чалавечых грудзях,
Дый забылі б мы мора смутку дый слёз...

Янка Лучына спрабаваў наладзіць выданне беларускай газеты. А яшчэ праз год ажаніўся з Ганнай Грыневіч. У гэты перыяд Янка Лучына шмат пісаў і перакладаў з іншых моваў. На жаль, паэт пражыў вельмі кароткае жыццё і памёр праз шэсць гадоў пасля жаніцьбы (у 1897 годзе) ва ўзросце сарака шасці гадоў. Ён быў пахаваны ў Менску на Кальварыйскіх могілках.

Шмат якія творы паэта не захаваліся да нашых дзён. Але тыя, што засталіся, зрабілі вялікі ўплыў як на нацыянальнае адраджэнне пачатку XX стагоддзя — напрыклад, з тэкста аднаго з ягоных вершаў нарадзіліся назвы беларускіх газет «Наша доля» і «Наша ніва», — так і на беларускую нацыянальную літаратуру.

Кірыл Стаселька



Сем з паловай плюсаў Уладзіміра Някляева

(Да 75-годдзя з дня народзінаў)

Фармат юбілейных словаў нібыта зацверджаны Мінюстам, але менш за ўсё хочацца думаць у дзень нараджэння паэта пра розныя фарматы і Мінюсты.

Калі ў тэксце павінен быць вытрыманы фармат, то навошта тады пісаць? Хіба з'ўляліся добрыя кнігі, у тым ліку кнігі Уладзіміра Някляева, выключна праз нейчае патрабаванне? Бадай, толькі ўнутранае жаданне самога паэта выводзіла іх на святло. Гэтак і я не стану распісваць рэгаліі, трымацца парадку, жанру, храналогіі, стэрэатыпаў, а скажу пра тыя плюсы Някляева, якія бачу сам. Якія, на мой погляд, дадавалі і дадаюць беларускай літаратуры сёе-тое.

1. Някляеў — жывы творца паэм. Гучыць як штосьці банальнае: ну, паэмы, ну, падумаеш... Паэты ж на тое і паэты, каб вершы і паэмы пісаць, правільна? Вось, маўляў, напрыклад, раптам пачынаеш перабіраць кнігі, адгортваць газеты і часопісы, якія яшчэ не закрыліся, і бачыш, што нават колькасна іх амаль няма. Добрай паэмы амаль няма. А такой, што можаш успомніць злёту і працытаваць — і пагатоў. Аднак справа не ў цытаце: выдатны радок знойдзецца шмат у каго. Някляеў жа ў найлепшых сваіх паэмах апошняга паўстагоддзя стварае Свет, у якім, як правіла жывуць два чалавекі. Я і Яна, Яна і Я. Здаецца, што з гэтых двух возьмеш? Як можна пра іх пісаць пяцьдзесят гадоў і не вычарпаць тэмы? Някляеў можа. Ніхто не можа, акрамя яго.

2. Дыялог. На чым трымаецца някляеўскі верш, някляеўская паэма, шмат што з прозы? На дыялогу, на размове, дзе нішто і ніхто не можа скончыцца. Перашэптваюцца каханкі, лётаюць духі і багі, героі мінулага і антыгероі сучаснага, часам у поўнай куламесе спрачаюцца, сварацца, а часам гэта амаль нячутны абмен думкамі двух у маўчанні. У Някляеве сутыкаюцца нейкія плыні часу і прасторы; прашываюць яго, як вецер, а ён, як той вынаходца вятроў, спрабуе ўтаймаваць стыхіі. Някляеўскі дыялог перашкаджае літаратуры быць бясконца аўтабіяграфічнай, ён патрабуе выдумкі, адхілення ад сябе, ад прыватнага досведу. Безумоўна, гэта плюс.

3. Ён умее быць розным. Я не пра тое, што ў розных кнігах не пазнаеш: наадварот, мне дык і старонкі «ўсляпую» не трэба, каб сказаць, што гэта ягоны фірмовы стыль. Я — пра пастаянную шматфарбнасць беларускага літаратара, які, з часоў Купалы і Луцкевічаў, можа і напісаць эсэ, і стаць на чале часопіса, пісаць вершы і раманы, ствараць праграму на ТБ, перакладаць п'есы для тэатра, пісаць песні для гуртоў, рабіць і даваць інтэрв'ю, выступаць на стадыёнах і ўладкоўваць справы сяброў па цэху. І часам усё гэта рабіць адначасова для таго, каб жыла Беларусь. Такія людзі былі і ёсць у нашай літаратуры. Але іх заўжды катастрафічна мала, іх бракуе. Някляеў адзін з іх.

4. Ён адкрыты новаму. Не ў тым сэнсе, што раз'язджае на электрасамакаце па Маякоўцы (хаця, можа, і раз'язджае — я б не здзівіўся). Але я не раз лавіў сябе на думцы: добра, каб і мне ў такія гады такія імпэт і цікавасць да новай літаратуры, да падзеяў і людзей, да знаёмстваў, размоваў, няхай сабе і спрэчак, урэшце рэшт — такога прыняцця свету як чагосьці бязмежна жывога і цікавага. У якім не зняверыўся, хоць нагодаў для гэтага больш чым дастаткова. У якім хочаш прымаць дзейны ўдзел і часам па-шасцідзясятніцку пераўтвараць, і выходзіць пераможцам.

5. Някляеў заўжды застаецца літаратарам. Успамінаю 2011 год: краіна аслепла ад судоў і аглухла ад дэвальвацый. Па крамах бегаюць бясконцыя натоўпы і выносяць пыласосы з лядоўнямі, на праспекце плякаюць масы мінакоў у вызначаны час і сігналяць машыны. Апошняе слова экс-кандыдата ў прэзідэнты Някляева на судзе прысвечана беларускай мове і яе катастрафічнаму становішчу ў Беларусі. Пра гэта не гаворыць і не думае ў гэты момант абсалютна ніхто, акрамя яго. Я быў проста агаломшаны ў той дзень і нават крыху пакрыўджаны, што ён не набраў такія лёгкія рэпутацыйныя «пойнты», неабходныя для далейшай палітычнай дзейнасці. Але Някляеў і ў судзе застаўся сабой — пісьменнікам. Паказаў, што для яго найдаражэйшае ў свеце — свая мова і сваё месца ў літаратуры. І цяпер, праз дзесяць гадоў, трэба сказаць, што я значна лепш разумею той ягоны крок.

6. Ён, безумоўна, прыроджаны імправізатар. Ва ўсіх сэнсах. Бадай што, ягоную біяграфію ведае толькі ён сам, а міфаў, гісторый, прыдумак выведзена проста безліч. Артыстызм зразае і выкідае ўвесь пафас. У той жа час ён нараджае апломб, самапавагу актора, які прамаўляе цэнтральны для п'есы маналог. Для Някляева нецэнтральных маналогаў няма, і на кожнай сцэне — хай гэта пакойчык на пяць чалавек, вялікая зала Дома літаратара, стадыён «Маладзечна-95» ці богведама што яшчэ — ён умее зачапіць і ўтрымаць аўдыторыю. Нават калі тое, што ён гаворыць — містыфікацыя.

7. Ён бывае бязлітасна дакладным. У вершы можна сысці ўбок незлічоную колькасць разоў, закруціцца ў сілаба-танічных вальсах і пырхнуць вераб'ём у чарговыя цянёты. Але бываюць такія вершы, пасля якіх хочацца закурыць. Пасля якіх закрываеш кнігу і пачынаеш мераць крокамі пакой. Можа быць, іх не 600 тамоў, як у Юзафа Ігнацыя Крашэўскага. Але на адзін том набярэцца. І гэтага цалкам дастаткова.

7,5. Ён не спыняецца.

І дзякуй Богу. З днём нараджэння, Уладзімір Пракопавіч!

Ціхан Чарнякевіч

Беларускія блізняты: як не блытаць Купалу і Коласа

Марына ЯРОМКА

Два класікі беларускай літаратуры, народныя паэты альбо два вусатыя дзядзькі з аднолькавымі ініцыяламі? Абодва нарадзіліся ў маляўнічых кутках нашай радзімы, абодва пісалі вершы і паэмы, якія ў школе вучаць на памяць. Паспрабуем усё ж разабрацца, чым яны адрозніваюцца як пісьменнікі — спасцігнуць тое, чаго не пабачыш на партрэтах, пра што не прачытаеш у біяграфіях.



Праблемы з вызначэннем аўтараў паэм «Сымон-музыка» і «Курган», ламанне галавы над тым, хто ж напісаў верш «Спадчына», сапраўдны ступар перад «Новай зямлёй». Янка Купала і Якуб Колас — беларускія пісьменнікі, вядомыя, бадай, кожнаму. Але нягледзячы на гэта, часта бывае складана вызначыць, хто ёсць хто. Ужо нават міф складваецца пра блытаніну класікаў. Дык як жа адрозніць такіх падобных (розных!) пісьменнікаў?

Пачаць, напэўна, варта з **тэматыкі вершаў.**

У **Якуба Коласа** чытач адшукае шмат твораў, дзе ствараецца вобраз прыроды. Вершы пра прыроду Коласа — класічны прыклад пейзажнай лірыкі і адна з пазнавальных рысаў яго творчасці.

Ноч павісла над зямлёю,
Ўсё абнята цішынёю,
Поўнай страху, поўнай чар.
Быў гарачы дзень бясконца,
Не сьвяціла — жэгла сонца,
Парнасць страшная і вар.
І вось неба не ўтрывала,
Ўсё ў агнях запалыхала,
Мрок хістаецца, дрыжыць...

(З верша «Вераб'іная ноч».)

Або, напрыклад, вершы «Палескія вобразы», «Родныя вобразы», «Адлёт жураўлёў».

Для **Янкі Купалы** ж чыста пейзажныя вершы не характэрныя. У многіх творах вобраз прыроды стварае фон для іншых важных для паэта тэм.

Вольным гоманам хвоек высокіх,
Туманамі санлівых нізін,
Казкай векаў блізкіх і далёкіх
Клічам, сонца, цябе як адзін!
Распусці залацістыя косы,
Схаладзелы загон аціплі,
Акваці лугавыя пакосы,
Ўсходы новыя сей на зямлі...
Як у свята купальскае, сонца,
Свой жывы абнаўляеш паглёд,
Аднаві славу нашай староньцы,
Аднаві яе сумны народ!
Хай нам явары вечныя думы,
Думы-байкі шасцяць, шаласцяць,
І нясуцца хай гэтыя шумы,
Па бел-свету ляцяць, хай ляцяць!

(З верша «Песня сонцу».)

І Купала, і Колас пісалі вершы, прысвечаныя праблемам грамадства, бо ў часы нашаніўства сацыяльнае і нацыянальнае становішча беларусаў было адной з найважнейшых тэм у літаратуры. Але і ў творах, прысвечаных «долі беларуса», можна выразна ўбачыць розніцу паміж паэтамі. Яна — у **настроі вершаў і ў шляхах вырашэння праблемы.**

Якуб Колас, ствараючы вельмі падрабязны, наглядны вобраз чалавека і яго жыцця, імкнецца выклікаць шкадаванне да лёсу беларуса. Выхад лірычны герой прапануе праз адукацыю, навучанне, якое мусіць узвысіць пакрыўджанага чалавека.

З нас нямала жартавалі,
Той нас крыўдзіў, гэты сек.
Годнасць нашую тапталі,
Ў нас заплёван чалавек.
Хай святло навукі яснай
Заблішчыць, як сонца ўсход,
Няхай родным словам шчасна
Загаворыць наш народ.

(З верша «Мы маўчалі, як нямыя».)

У вершах Янкі **Купалы** пераважае настрой актыўнага супрацьстаяння, які аўтар распальвае ў сваім чытачу рознымі паэтычнымі сродкамі (звароты, заклікі, паўторы). Спосаб пераадолення сітуацыі — гэта змаганне як заканамерны вынік нанесенай крыўды.

Паўстаньце, рабскія натуры,
Пакіньце свой адвечны сон,
Загаманіце віхрам, бурай,
Каб ажна дрогнуў ваш палон!

(З верша «Прарок».)

Тут бачна, што паэты па-рознаму падыходзілі да вырашэння надзённых для іх пытанняў: паступовы, «рэфарматарскі» шлях Якуба Коласа і рэзкая, «рэвалюцыйная» барацьба Янкі Купалы.

Вельмі важны складнік верша — рытм, афармленне ў радкі і строфы.

У **Якуба Коласа** вершы заўжды вытрыманыя рытмічна ў тым памеры, які аўтар абірае для твора.

Ці дома я, ці я ў паходзе,
Калі адзін, як воўк, брыду, –
У кожнай хвілі і ў прыгодзе
З сабой нясу дум чараду.
За ёю сьледам сумным ходам
Малюнкі прошласьці плывуць,
І так мне жаль іх і так шкода,
Што іх нанова не вярнуць.

(З верша «Ці дома я, ці ў паходзе...»)

Янка Купала часта карыстаецца рознай рытмікай у межах аднаго твора, разрывае радкі, парушаючы традыцыйнае чаргаванне складоў.

А хто там ідзе, а хто там ідзе
У агромністай такой грамадзе?
— Беларусы.
А што яны нясуць на худых плячах,
На руках у крыві, на нагах у лапцях?
— Сваю крыўду.
А куды ж нясуць гэту крыўду ўсю,
А куды ж нясуць напаказ сваю?
— На свет цэлы.
А хто гэта іх, не адзін мільён,
Крыўду несць навучыў, разбудзіў іх сон?
— Бяда, гора.
А чаго ж, чаго захацелась ім,
Пагарджаным век, ім, сляпым, глухім?
— Людзьмі звацца.

Рытміка ўплывае на пачуццёвае ўспрыманне верша, дазваляе неабходным чынам размясціць акцэнты. Да выкарыстання рытму, даўжыні радка як да сродкаў стварэння настрою верша паэты падыходзілі па-рознаму.

У вершах Якуба **Коласа** пераважае рытміка, якую часта называюць «лёгкай». Яна надае творам песеннасці, спрашчае іх успрыманне.

Я ня знаю сам, браточкі,
Чаму мне так мілы
Буры, плач асенняй ночкі,
Спеў яе пастылы,
Лесу гоман, гуд нястройны,
Шум лазы ў балоце,
Баязлівы, неспакойны
Шолах у чароце.

(З верша «Я не знаю...»)

Падвесці ўсе творы пад адну формулу, натуральна, немагчыма, але ў многіх сваіх вершах Янка Купала карыстаецца доўгім радком, назапашвае, канцэнтруе эмоцыі, робячы цяжкае яшчэ больш невыносным.

Чую я, чуе сэрца маё жаласлівае,
Душа ные, а болем здымаюцца грудзі;
Як радзіўся,
ішло ўсё са мной нешчаслівае, –
Не пацешылі ў смутку і добрыя людзі.

(З верша «Адповедзь».)

Розніца паміж пісьменнікамі праявляецца і ў **падыходзе да адлюстравання рэчаіснасці**.

Акрамя падрабязнасці, вершам Якуба **Коласа** ўласцівая дакладнасць, праўдзівасць вобразаў. Паэт фарміруе ўражанне на падставе знешніх назіранняў, вобразаў навакольнага свету.

Якуб Колас — пісьменнік-рэаліст, у якога асноўная нагрузка прыпадае на дэталізацыю рэальных вобразаў.

Ціха ў хаце. Сэрца ные.
Страх душу апанаваў.
Чаму ж, вецер, думкі злыя
Ты ў душу маю нагнаў?

(З верша «Асенні вечар».)

У вершах Янкі **Купалы** меней канкрэтыкі, але больш акцэнт на асноўным вобразе або настроі, які вынікае пераважна з бачання лірычным героем пэўнай праблемы.

Сімвалічныя, рамантычныя вобразы набываюць няясныя ў рэальнасці, але заўважныя і значныя для чалавека рысы, ставяць на першае месца не знешні свет, а яго ўспрыманне і перапрацоўку лірычным героем.

Прадсмертнаю кляцьбой
канаючага раба,
Малітвай грэшніка, зарэзаўшага матку,
Звярнуся к сонцу,
сонцу без канца й пачатку,
Хай спаліць мне душу,
як ствол разбіты граба,
Хай вочы высмаліць,
як кветку ў лілы слабай,
Але і крыж мой спапяліць
хай папараду!

(З верша «Сярод магіл».)

Асэнсаванне ўласнай ролі як творцы заўсёды важнае для пісьменніка.

Лірычны герой **Коласа** разумее несправядлівасць існага становішча, паказвае расчараванне і незадаволенасць чалавека. Паэт у коласаўскіх вершах, спачуваючы людзям, не вылучаецца як правадыр, застаецца побач, нараўне з усімі, «апяваючы» людское гора.

Ці ж я з сэрцам не хварэю?
Ці ж мне смутак лёгка даўся?
Я спяваю, як умею,
Я пра радасць пець ня здаўся.

(З верша «Пясняр».)

Янку Купалу небеспадстаўна называюць паэтам-прарокам, які разумеў сваю ролю «ўладара роднай песні». Лірычны герой яго вершаў — чалавек «з неспакойнай душой», які ўсвядоміў праўду і хоча волі. У Купалы шмат вершаў, напісаных з пазіцыі паэта, які хоча паказаць людзям іх цемрашальства, хоча, каб яно было пераадоленае. Часта гэта робіцца праз прамы заклік да дзеяння.

Гэй, прасніся, беларусе!
Усе людцы паўставалі.
Гэй, прасніся, беларусе!
Усе праўдачку пазналі.

(З верша «Хоць ты, сэрца, лопні, трэсні...»)

Якуб Колас і Янка Купала, аб'яднаныя агульным гістарычным кантэкстам, адрозніваюцца мастацкім асэнсаваннем, спосабам адлюстравання рэчаіснасці.

Якуб Колас — пісьменнік-рэаліст, уважлівы да дэталей знешняга свету, майстар пейзажнай лірыкі, прыхільнік строга вытрыманага рытму. Выйсце са складанай сітуацыі паэт бачыць у паступовым самаўдасканаленні.

Янка Купала — рамантык, сімваліст, які абвастрае пачуцці, эксперыментуючы з вершаваным радкам. Ён у ролі паэта-прарока прапануе рашэнне нацыянальных праблем праз актыўнае і неадкладнае змаганне, чакаючы ад беларусаў, што на заклікі яны адкажуць дзеяннем.

Пано «Навука»



Віктар ВАРАНЕЦ

Іван Іванавіч Северны ўзяў скураны партфель, зірнуў у люстэрка і, задаволены ўбачаным, выйшаў з кватэры па вуліцы Ажэшкі, 41. Працаваў Іван Іванавіч на адказнай пасадзе начальніка арганізацыйнага аддзела абкама партыі, чым вельмі ганарыўся.

Да будынка абкама, які месціўся на той жа вуліцы, было метраў сямсот-васямсот, і Северны заўсёды дабіраўся пешшу, паколькі, на яго думку, гэта было карысным для здароўя і набліжала функцыянера да народа. Прыгожым кастрычніцкім ранкам Іван Іванавіч павольна крочыў па вуліцы, па-гаспадарску разглядаючы наваколле. Але як толькі ён прашыбаваў каля педагагічнага інстытута, нешта непрыемнае разанула вока. Северны спыніўся і агледзеўся. Не, усё, здаецца, добра, як і заўсёды. Але нешта ж разанула? Тады ён вярнуўся крокаў на пяцьдзясят і пачаў уважліва аглядаць тратуар, слупы, будынак. І раптам ледзь не страціў прытомнасць. На тарцавой сцяне дома №19 выразна праступала вялізная фашысцкая свастыка. Іван Іванавіч з усіх ног кінуўся ў аблвыканкам. А ўжо праз паўгадзіны да дома падагналі аўтавышку, і два рабочыя хуценька зафарбавалі ганебны малюнак. Была самая раніца, людзей на вуліцы зусім мала ды і тыя не звярталі асаблівай увагі на сцены дамоў. Таму гэтая падзея засталася сярод гараджан практычна незаўважанай. Затое паслужыла прадметам сур’ёзнай размовы на пасяджэнні бюро абкама партыі.

— Таварышы, — Мікіта Сяргеевіч Крупін, трэці сакратар абкама, строга агледзеў прысутных, — толькі дзякуючы пільнасці таварыша Севернага мы ліквідавалі ідэалагічную дыверсію ў горадзе. Ды што там у горадзе — у краіне, не пабаюся гэтага слова. Дзякуй, паважаны Іван Іванавіч! І хацелася б паслухаць старшыню гаркамгаса таварыша Лісоўскага. Як такое магло стацца ў нашым цудоўным горадзе?

З месца падняўся тоўсты, як кадка, і такі ж нізенькі чалавек з пунцовым ад хвалявання тварам.

— Таварышы, сцяну на доме №19 фарбавалі яшчэ да майго з’яўлення ў Гродне, і таму за яе я не магу несці адказнасць.

— А ты не перакладай праблему на чужыя плечы, — кінуў першы сакратар абкама. — За дамы ў горадзе ты адказваеш, вось і растлумач прысутным таварышам, як плануеш вырашаць праблему.

— А чаго тут думаць? — развёў рукамі Лісоўскі. — Сцяну зафарбавалі, і цяпер нічога нябачна.

— Цяпер, можа, і нябачна, — з’едліва загаварыў Крупін,— а па вясне пасля дажджоў і снегу зноў вылезе? І што, будзем чакаць, пакуль таварыш Северны дасць своечасовы сігнал?

— А што яшчэ я магу зрабіць? — здзіўлена закруціў галавой Лісоўскі. — Рэха вайны...

— А давайце на гэтай сцяне размесцім прыгожае пано, — як бы баючыся, ціхенька заўважыла з месца вастраносенькая жанчына. — Я ў Таліне бачыла. Вельмі прыгожа.

— Правільна! — тут жа падтрымаў з трыбуны Крупін. — Вось слушную прапанову ўнесла таварыш Зайцава. Абавязкова вялікае пано на тэму навукі і адукацыі. Каб на вякі! Там жа насупраць педагагічны інстытут. Дык будзем выхоўваць, таварышы, будучых педагогаў на прыгожых прыкладах з нашага жыцця. Вы не супраць, Сямён Уладзіміравіч?

Крупін павярнууўся да першага сакратара. Той згодна кіўнуў галавой.

Зрабіць пано даручылі маладым ленінградскім мастакам Пятру Сяргееву і Сяргею Мацвееву, якія два гады назад былі ў Гродне на практыцы. Неўзабаве хлопцы з’явіліся ў горадзе, а часовую майстэрню разгарнулі ў спартыўнай зале педінстытута. Ствараць пано вырашылі па ўласна распрацаванай методыцы: спачатку склеіць з лістоў кардону барэльеф у натуральную велічыню, намаляваць саму выяву барэльефу і выразаць асобныя дэталі.

З дапамогай будаўнікоў хлопцы прымацавалі да даху дома №19 люльку на металічных тросах, залезлі ў яе і спусціліся метры на паўтара. Заверашчалі электрычныя фрэзы, і паляцела высахлая фарба ва ўсе бакі. Мастакі былі ўпэўнены, што пад пластамі фарбы павінна быць страрадаўняя тынкоўка (не цэглу ж продкі малявалі?). Так яно і сталася. Неўзабаве паказалася і жоўтага колеру тынкоўка. Фарба здымалася лёгка, паколькі шмат яе наслаілася за дзесяцігоддзі. Да абеду хлопцы зачысцілі амаль палову сцяны. Час быў зрабіць невялікі перакур. Яны спусціліся на зямлю і пакрочылі ў студэнцкую сталоўку. А калі вярнуліся, сытыя і задаволеныя, пачалі разглядаць першыя вынікі сваёй працы.

— Сяргей, — раптам парушыў маўклівае любаванне Пётр, — а што гэта за малюнак у левым куце?

— Ну так, — прыглядзеўшыся, пагадзіўся сябар, — і сапраўды штосьці надрапана. Трэба ж, а зблізу падалося, што проста драпіны. Глядзі, нейкая арка, перакрыжаваныя інструменты і надпіс «1907». І што гэта азначае?

Пётр з хвіліну памаўчаў, нешта натужліва ўспамінаючы.

— Слухай, Сяргей, я дакладна бачыў дзесьці гэты малюнак. Толькі дзе?

— Хутчэй за ўсё ў 1907 годзе тут у Гродне, — рагатнуў Сяргей.

— Во, яшчэ адзін Аркадзь Райкін з’явіўся на маю галаву, — прабуркацеў Пётр. — Пайшлі лепш працаваць...

У суботу раніцай, гадзін у пяць, нехта моцна затрос Мацвеева за плячо. Той неахвотна расплюшчыў вочы і ўбачыў Пятра.

— Сярога, — узбуджана крычаў Пётр, — я ўсю ноч успамінаў той малюнак на сцяне і нарэшце ўспомніў, дзе яго бачыў.

— А ты не мог успомніць гадзіны на тры пазней, — незадаволена прамармытаў хлопец.

— Глупства, — па-ранейшаму бадзёра працягваў Пётр. — Нацягвай майткі і хуценька пабеглі...

Хвілін праз сорак яны ўжо былі на Старым мосце. А калі перайшлі Нёман на супрацьлеглы бок, Сяргееў імгненна пераскочыў праз невысокі бар’ерчык і пачаў спускацца па адхоне да ракі. Сяргею нічога не заставалася, як падтрымаць прыклад сябра. Неўзабаве яны спусціліся да самага берага, і Пётр паказаў рукою на адну з апор маста. І сапраўды, яна была дакладна такой, як выглядала схематычна на сцяне: і цагляная арка, і перакрыжаваныя інструменты, і надпіс «1907».

— І што цяпер? — зацікаўлена запытаўся Сяргей.

— А я адкуль ведаю? — чамусьці злосна буркнуў у адказ Пётр. — Павінна быць яшчэ якая падказка. Не проста ж так чалавек драпаў на сцяне выяву апоры.

— Я так разумею, што падказку лепш шукаць на сцяне, а не пад мостам, — не без іроніі заўважыў Сяргей.

— І я так думаю! — пагадзіўся Сяргееў. — Трэба зноў лезці на сцяну.

— Дык сёння ж выхадны, — запярэчыў Сяргей.

— І што? Будзем ляжаць на ложку, а хтосьці іншы адгадае таямніцу і скарыстаецца ёй? Тут не да адпачынку.

— А ты сур’ёзна думаеш, што дзесьці схаваны клад?

— Я ўпэўнены ў гэтым. Пайшлі зараз у блінную на Савецкай, паснедаем, а па дарозе я табе раскажу, што накапаў за ўчарашні вечар. Пакуль ты адпачываў, дарэчы...

Як высветлілася, Пётр пасля працы адразу рушыў у Гродзенскі архіў, дзе (бываюць жа такія супадзенні!) дырэктарам працавала Маша Ігнатава, выпускніца Ленінградскага архіўнага інстытута, даўняя знаёмая хлопцаў па танцах, паколькі іх інтэрнаты стаялі насупраць адзін аднаго.

Вось у Машы (цяпер Мар’і Іванаўны!) Сяргееў і папрасіў даць пагартаць падшыўку якой-небудзь гарадзенскай газеты за 1907 год. Знайшлася толькі «Северо-западная жизнь», ды і то не ўсе нумары. Але хлопцу зноў пашчасціла. У адной з газет на першай паласе прачытаў буйнымі літарамі загаловак «Абрабаванне Віленскага зямельнага банка ў Гродне». Трое невядомых у масках адразу пасля адкрыцця банка ўварваліся са зброяй у памяшканне банка, схапілі яшчэ не распакаваныя мяшкі з залатымі чырвонцамі, агульнай колькасцю 3000 рублёў, і выбеглі на вуліцу. У гэты час каля будынка банка праходзіў гарадавы Мітрохін, які, убачыўшы людзей у масках і са зброяй, некалькімі стрэламі з рэвальвера цяжка параніў аднаго з бандытаў, але і сам атрымаў кулю ў скронь. Астатнім рабаўнікам удалося знікнуць. Паліцыя горада распачала следства.

— І што цяпер? — пацікавіўся Сяргей.

— Як што?! — ажно ўзвіўся Пётр. — Прачніся! Там трыста залатых чырвонцаў!

— Там — гэта дзе? — усё тым жа раздражнёна-спакойным тонам запытаў Сяргей.

— А вось гэта нам трэба высветліць. І таму мы палезем зноў на сцяну, і прагледзім кожны сантыметрык. Павінна там быць нейкая падказка.

— Добра, — пагадзіўся Сяргей, — але растлумач мне: чаму падказку трэба было рабаўнікам размяшчаць на такой вялізнай сцяне?

— А я табе растлумачу! — адразу ж пагадзіўся Пётр. — У наступным нумары той жа газеты «Северо-западная жизнь» апісана чарговае здарэнне: адначасова зніклі два чалавекі — Мікіта Зотаў, які ў Максіміліяна Абрэмбскага наняўся перафарбаваць дом, наш дом №19, і Фёдар Зыкаў, заняты на будоўлі апор новага маста праз Нёман. Прычым, што цікава, абодва выканалі да канца даручаную працу, але па грошы не з’явіліся. Паліцыяй высветлена, што гэтыя грамадзяне былі знаёмыя адзін з адным, абодва прыехалі з Пецярбурга і пры найме на працу папрасілі аплату амаль удвая меншую за звычайную.

— І што?

— Ну як што? — Пётр спыніўся і паказаў рукою на лаўку. — Ідзі сюды!

Яны селі, хлопец падабраў нейкі пруцік і пачаў маляваць на зямлі.

— Вось паглядзі: гэта вуліца Ажэшкі, вось банк, які абрабавалі, а вось дом, які размалёўваў бандыт. Бачыш, адлегласць метраў пяцьсот, не болей. Бандыты фарбавалі сцяну і назіралі, калі прывязуць залатыя чырвонцы. Хутчэй за ўсё інфармацыю скінуў нехта з банка. Як толькі карэта з золатам праехала, яны пакрочылі следам, і далей па сцэнарыі. А вось натыкнуцца на гарадавога не спадзяваліся. І калі даведаліся, што падзельнік паранены, спалохаліся: а калі ўсё раскажа паліцыі? Але замест таго, каб уцякаць з горада, Зотаў хуценька і бясплатна дафарбоўвае сцяну. Звар’яцеў? Не, ён штосьці хаваў на сцяне, і гэта самае зручнае месца, бо потым калі не сам, то пасланец вярнуўся па золата.

— Добра, а што Зыкаў рабіў?

— Сярожа, Сярожа, — як з малым пачаў сюсюкаць Пётр. — Ну ўключы мазгі. Дзе працаваў Фёдар?

— Здаецца, ты казаў, што на масце.

— Правільна. А што надрапана на сцяне?

— Апора маста... А-а-а, — схапіўся за галаву Сяргей, — я зразумеў: Зыкаў схаваў золата ў схованцы ў апоры моста.

— Малайца! — пахваліў Пётр. — Нарэшце пачаў варушыць мазгамі. Ты ўяві: горад умомант ачапіла паліцыя. Вывезці два мяхі з золатам вельмі складана. А дзе схаваеш у незнаёмым горадзе? Ды так, каб ніхто і не падумаў? Правільна, у новым мосце на самым людным месцы.

— Слухай, і што, золата там, у мосце, ці яго ўжо забралі?

— Разумееш, бандытам паказвацца зноў у Гродне было не з рукі: я думаю, трэці падзельнік падрабязна іх апісаў паліцыі, лежачы ў бальніцы. Але і камусьці чужому даверыцца страшна: а калі падмане і збяжыць з золатам? Час ішоў, яны, пэўна, шукалі надзейнага чалавека, але, думаю, так нікому і не паверылі да канца. Інакш старая фарба на сцяне была б ужо абадраная. Канешне, яны маглі і на словах расказаць, дзе скарб, і тут ужо як нам пашанцуе.

— Гэта я зразумеў, — Сяргей пачухаў свой кірпаты нос. — Але чаму мы тады ідзем зноў да сцяны, а не да апоры, дзе, як ты кажаш, схаваны скарб?

Пётр усміхнуўся:

— Там, на сцяне, павінна быць падказка. Вось яе мы і адшукаем!

Праз паўгадзіны хлопцы ўжо віселі на сцяне ў люльцы. Праца закіпела, але іх высілкі былі дарэмнымі: ніякіх знакаў ніжэй на сцяне не было. Непрыкметна надышоў вечар. Брудныя, галодныя і знясіленыя, хлопцы ў роспачы пападалі на траву газона. Гаварыць зусім не хацелася. Яны ляжалі і моўчкі глядзелі ў сцярнелае неба, на якім пачынаў абжывацца яшчэ зусім празрысты месяц.

— Але ж я і дурань! — раптам пляснуў сябе па ілбе Пеця. — Сяргей, за мной.

Яны зноў падняліся ў люльцы да малюнка, Пётр уключыў ліхтарык:

— Ёсць! Бачыш, арка падзелена на квадрацікі. Гэта, мяркую, цагліны, а ў кожнай стаіць лічба. Гэта парадкавы нумар цэглы. А восьмая, шаснаццатая, дваццаць чацвёртая і трыццаць другая назначаны крыжыкам. Вось тут і трэба шукаць.

У пяць гадзін раніцы наступнага дня яны зноў былі каля аркі. Пільна ўглядаючыся ў цагліны, хлопцы сапраўды ўбачылі на іх ледзь прыкметныя надрапаныя лічбы. Квадрат з 8-й, 16-й, 24-й і 32-й цаглін утвараў ніз арачнай нішы. Пётр схапіў прынесеную з сабой стамеску і стаў выкалупваць адзначаныя цагліны. На дзіва, яны лёгка падаліся, і неўзабаве хлопцы ўбачылі досыць аб’ёмнае паглыбленне, на дне якога ляжала нейкая зжаўцелая паперка. Асцярожна, каб яна не рассыпалася, хлопцы акуратна дасталі і разгарнулі яе. Выцвілымі ад часу чарніламі там была напісана адна толькі фраза:

«А Вы таленавіты чалавек, калі змаглі адгадаць нашу загадку і знайсці гэтае месца, таму Вам прыз пераможцы!».

Пётр яшчэ памацаў рукою ў выемцы і дастаў два залатыя чырвонцы.

— Апярэдзілі, — толькі і сказаў Сяргей...

Праз тры тыдні на вуліцы Леніна адбылася ўрачыстая цырымонія адкрыцця новага пано «Навука». Кіраўнік горада горача дзякаваў стваральнікам гэтай кампазіцыі Пятру і Сяргею, задаволеныя гродзенцы доўга пляскалі ў далоні. А хлопцы ўдзячна ківалі галовамі, моцна сціскаючы ў потных далонях запаветныя чырвонцы.

Званок Беларусі
Вершы з праекта wir.by

Вольга ГРОНСКАЯ

* * *

Тут,
дзе адвечную песню пяе Белавежа,
дзе зямля і нябёсы вакол —
з пашырэннем «бай»,
мы выходзім на вуліцы
ў чырвонай і белай адзежы
і штодня адчуваем наноў,
што вось гэта ўжо —
край.
Нас гэты год пазнаёміў з сабой і суседам.
Мы вастрыць пачалі не сякеры —
свае радкі.
І калі небяспека — ратуюць глыбіні.
Мы ведаем:
у глыбінях не будзе страшна.
Бо дно — не ў ракі.
Тут людзі без зброі насупраць
людзей без пагонаў.
І літары SOS замест абарванага
«Жы...»
лятуць у эфір з адключаных тэлефонаў,
з краіны,
ў якой мы сталі баяцца жыць.
З краіны, ў якой мы хочам
застацца жыць.

Артур КАМАРОЎСКІ

* * *

хвіліна маўчання
перарваная на дзясятай секундзе
напамінкам пра сорак першы
проста ля нашых ног была
незалежнасць
якой пагражалі фізічнай сілай
калі мы будзем адкрываць раты
(мы ўжо ведалі што яны робяць
з нашымі ратамі)
а мы адкрывалі
бо нашае маўчанне даўно зацягнулася
бо ў нашых ратах ўжо нарадзіліся
новыя словы
бо карабель састарэў і тоне
пацукі пакуль не бягуць
але непазбежна
бо нашыя целы —
саспелыя яблыкі й грушы вялікага сада —
прагнулі волі і лёту
і вялікай зямлі
хвіліна маўчання
па целах
збітых на горкі яблык
па целах
якія былі грушамі для біцця
па садзе
што быў маладым
новыя дрэвы нам абяцалі квітнець
мы трымалі ў руках самлелыя кветкі
як напамінак пра нашыя целы
што млелі ў няволі
(пакуль яны жэрлі лісце й кару
пілі салёны бы слёзы сок)
мы абяцалі прыходзіць
кожнага дня
пакуль незалежнасць трымае на спіне
нашыя дрэвы
пакуль вялікі язык акіяну
не зліжа стары карабель
пакуль жнівень будзе загойваць шнары
пакуль яблыкі й грушы будуць падаць
каб жыць

Даша БЯЛЬКЕВІЧ

Званок Беларусі

Пяты гудок без адказу страхам
сціскае жывот,
месяц камбайны ўлады ўдарна
праводзяць жніво.
Выспела і прачнулася спрэс
ненажэрнае зло,
мы вінаватыя самі — дазволілі, каб
жыло.
Зло не наелася галасамі,
зло захацела галоў,
скошаных з плеч чалавечых,
знявечаных да асноў.
Краіна трывала доўга,
зло выдзірала стырно,
на скрыжаванні глыбокае
беларускае зараўло.
Пра здзекі, гвалт і знявагу,
пра тое, што ёсць і было,
адсутнасць сумлення,
закону — падзенне на самае дно.
У цемры, у холадзе, у смутку,
наеўшыся валуноў,
працягнем ісці наперад,
мы прагнем вярнуць святло...
Пяты гудок сканчаецца,
я чую тваё «ало».

Ганна ОТЧЫК

* * *

снілася, што я абмяняла кватэру
(якой у мяне няма)
на хату, дзе ваду награвае сонца
але дзяўчына, што аддала мне хату
забрала сонца з сабой
снілася, што да мяне прыйшла казуля
з пакрышаным сцягном
яна нарадзіла аленяня
але не магла яго выкарміць
снілася, што прыходзіла труска
нарадзіла трусяня
якое не магла выкарміць
і я блытала аленяня з трусянём
такія яны былі драбнюткія
снілася, што прыходзіла дзяўчына
з якой мы калісь сябравалі
але перасталі, як яна пачала
сустракацца з надзейным мужчынам
і яна прыйшла, каб са мною павітацца
і напаіць атрутай усіх маіх жывёлаў
яны парушалі яе спакой
снілася, што ў БДУ
скасавалі ўсе факультэты
абвясцілі яго ўніверсітэтам
драўлянага дойлідства
у якасці матэрыялу пастаўлялі
агромністыя карчы
якія здабылі, калі парэзалі ўвесь бэз
усе чаромхі й каштаны
перад маёй хатай
снілася, што прыйшоў АМАП
і выцягваў мяне з-пад ложка
дзе я хавалася разам са сваімі снамі
дзіцячымі лялькамі
як калісь дзед хаваўся ад гестапаўцаў
а гестапавец падараваў яму цукеркі
снілася, што дзед зноў жывы
снілася, што ў мяне нікога няма
і нічога няма
і пад ложкам я ляжу ў пыле
маленькая і слабая
з пасохлымі бэзавымі галінкамі
й фанцікамі
снілася што я хачу прачнуцца
бо гэта ўсяго толькі страшны сон
снілася нешта страшнае
не памятаю што

* * *

яны коцяцца ў шэры шэры шэры
брудны шэры што робіцца праз зь-
мяшэнне жывых
колераў беспрытомнымі бруднымі
пальцамі
стомленнымі праз няздольнасць выма-
ляваць нешта шчырае бо шчырае
у сабе знішчылі
яны рабілі выгляд што іх колеры чорны
чырвоны й зялёны, але іх чорны шарэе й
чырвоны шарэе й зялёны шарэе
праз адвечную стому праз ілжывыя цені
шэрагаў
жаўнераў за іх штандарамі без якіх
ім ніколі не сабраць жніво
яны робяцца шэрымі шэрымі шэрымі
бо пашкрэбай іх — тое нябожчыкі
ашуканцы што чапляюцца пачварнымі
кручкамі замест пальцаў
за чужую душу й жыццё
з іх шматкамі злятаюць маскі
вышчэрваюць
парэшткі спарахнелай імшы
ашуканскай нішчымнай імшы
яны робяцца шэрымі шэрымі шэрымі
цьмяны шоргат саранчы але яшчэ адно
тая саранча — злічоная яна ў меншасці
яна меншыцца
агаломшаная нашым жыццём

Ігар КУЛІКОЎ

Беларусь

Мы ўжо блізка як трыццаць гадоў —
грамадзяне РБ,
той краіны, што ў цэнтры Эўропы, і
ўвесь гэты час
нам казалі, нахмурыўшы лоб: «You from
Russia?» — і мы
не згаджаліся перш, але потым махалі:
«From Russia».
Свет не ведаў пра нас, і калі нас агор-
тваў сумнеў,
мы шчыпалі за пашпарт, прапіску, Чар-
нобыль, БелАЗ,
Вайну й Брэсцкую крэпасць, стабільнас-
ць, зуброў і г. д. —
і здавалася нам: не, не спім, мы — з РБ, з
Беларусі.
І вось толькі цяпер, калі нам пальцы
сінія зноў
сцялі горла ды гэтак, каб голас прапаў
назаўжды,
калі нас пачалі на пацеху сабе катаваць
і да смерці збіваць у турме, каб мы
зніклі без вестак,
мы прачнуліся ў здзіве ды гневе ў сваю
Беларусь,
зразумеўшы нарэшце: не мы з Беларусі
— ЯНА
З НАШЫХ ДУШАЎ,
ЯКІЯ ЎЗАЕМАБАЛЯЦЬ,
З НАШЫХ СЭРЦ,
ШТО ЎЗАЕМАПАЛАЮЦЬ.
І тады увесь свет, што дагэуль не ведаў
пра нас,
нашым сцягам сапраўдным аздобіў свае
гарады
і разлёгся шматтысячным клічам
«Жыве Беларусь!»,
бо любоў заўжды там, дзе злу кажуць:
«Даволі!».

Макс ШЧУР

* * *

Зямля без радзімы проста планета
дзіцячы дом з выгодамі але не бацькоўскі
жыццё без радзімы і яе людзей проста
жыццё
мо і не горшае але дакладна не лепшае
мова без слова «радзіма» пазбаўляецца
пафасу
але траціць сваю чарадзейную мі-
фатворчую здольнасць
компас без полюсаў прыцягнення не компас
і нікому не пакажа дарогі
гэта кажу вам я
як касмапаліт-інтэрнацыяналіст

14.09.

Юля ЛІСІЦА

* * *

гэтая восень з лакця пачалася з любові
я больш не магу не падняць на яе вачэй
сэрца забыла на рытмы, сціхла без бою
спакой раструшчаны вірам бяссоных
начэй
мой човен заплыў ў буйную ліпкую стому
ў кутах тут асіплыя крыкі, шумы гармат
а свет згарнуўся пікселем побач з табою
праз зубы мурлыча — свабоду ад барыкад
пазней я ўзыду на той некрывавы бераг
паклічу цябе з сабой, прыплыві па траве
там побач будуць стаяць мільёны
смелых
ў абдымку, морамі, з намі. беларусь
жыве

Вера ЖЫБУЛЬ

* * *

Прыбачылася.
Цемра, суцэльная,
непераадольная цемра.
Працягваеш руку ў цемру, каб намацаць,
ці не натыркнешся на нешта,
і намацваеш рукі, рукі,
і хтосьці паціскае тваю руку.

Дар'я ЛІС

* * *

Гэтыя хлопчыкі — дзеці цемры,
грахі неадмоленыя
сваіх дзядоў.
Павернешся спінай —
пам'рэш першым.
Ты слабак.
І твой сцяг — адстой.
Чужыя? Свае...
Хочаш спэўніць?
Ідзі.
Тваё неба з табой.

Сяргей ПРЫЛУЦКІ

«Герой» эпохі нестабільнасці

Адна галава ў аўтазаку добра,
а тры — яшчэ лепей.
Дагэтуль сістэма не давала збой.
Я бараню ў балаклаве нашы скрэпы.
Жонка з дзецьмі пойдуць у пекла
са мной.
Перад сном лічу і ем авечак,
уяўляючы, што я воўк.
Мая зброя яшчэ не давала асечак.
Мая мама даўно закрыла рот на замок.
Займаемся з калегамі
цяжкім спортам —
трэнуемся на жывым матэрыяле.
Мой прэзідэнт яшчэ тая морда.
Але ж і мы са знешнасцю не падкачалі.
Б'ем рабацяг, дзяцей,
пенсіянераў, паэтаў.
Калі што — завязем новых.
Унукам распавяду потым пра гэта.
Але не ўсё — хопіць з іх і паловы.

Марыя МАРТЫСЕВІЧ

Як я скарыстаюся (р)эвалюцыяй

заб'ю ў сабе змяю
пабудую дом творчасці
нараджу дачку
пасаджу чазенію ў Менску
на бульвары Караткевіча
ідэяў шмат
штодня заношу іх у ружовы нататнік
з вясёлкавым аднарогам на вокладцы
рамантык
фанатык
нягодніца
ў адным флаконе
хаджу басанож
каб не пераабувацца

* * *

Тысячы затрыманняў,
сотні адсідак –
але недзе пад Янавам
танчаць сямсот хасідаў.
Танчы — й ніхто цябе
не саб'е з маршрута;
вер мне, як юдэйскаму Б-гу:
усё будзе крута.

Водар валадарства

З кнігі «Беларусалім. Сэрца святла»



Павел СЕВЯРЫНЕЦ

Ерусаліме, Ерусаліме,
Што забіваеш прарокаў,
І камянямі пабіваеш пасланых да цябе!
Колькі разоў хацеў
Я сабраць дзяцей тваіх,
Як птушка птушанят сваіх пад крылы,
І вы не схацелі!

Евангелле паводле Лукі, 13:34

Для чалавека няма нічога больш шчымлівага, чым пах волі з-за кратаў.

Дробныя пырскі дажджу, разбітыя сталёвымі прутамі, асвяжалі твар Льва, а з вачэй цяклі буйныя кроплі. Гоcпад старанна мыў яго аблічча. Мабыць, перад сустрэчай — каб увесці ў Свае Валадарства чыстым.

Валадарка, нармалёвая турма. Пасля года халоднай кафлі падвала, без неба, сонца і свежага паветра, пасля пранізлівага паху хіміі і жалеза, ад якога стыла кроў, турма на Валадарскага здалася Льву домам родным.

Перавялі ноччу. Ён зразумеў толькі ў адсеку аўтазака, што выехаў з падземнай паркоўкі. Каўток цёплага паветра, напоенага пахам зямлі, травы і чалавека, выклікаў спазмы горла ды слёзы і нібы вярнуў яго з таго свету.

О, Валадарка, беларуская Бастылія! Турэмны замак, дзе сядзелі паўстанцы Каліноўскага, тэрарыст Іван Пуліхаў, рэвалюцыянер і паэт, аўтар дзіцячых кніжак Алесь Гарун, заснавальнік ЧК Фелікс Дзяржынскі, паэт-камуніст Максім Танк і віленскі беларус, начальнік польскай дзяржавы Юзаф Пілсудскі! Валадарка, дзе Дунін-Марцінкевіч задумаў «Пінскую шляхту», а Якуб Колас пачаў «Новую зямлю»! Валадарка, дзе забівалі беларускіх падпольшчыкаў, беларускіх паліцаяў і беларускіх паэтаў...

Адзінае месца ў Еўропе, дзе ажыццяўляецца смяротнае пакаранне — праз расстрэл.

Адзіночка з драўлянымі нарамі ўздоўж сцяны і парашай у куце была ўтульная, як бацькоўская хата пасля доўгай вандроўкі. Кавалкам глыбокага чорнага неба, што мігцеў у аправе вакенца ўгары, Леў упершыню за год упіваўся да раніцы. У грудзі хлынула чыстае паветра з форткі.

І дождж... Пах праху зямнога, амытага вадой з неба.

Тут, у крэпасці беларускага зла, дзень і ноч гадамі ідзе цяжкая мясарубка бесаў з анёламі. Тут, у каменным замку, набрынялым пакутай, страхам і пахам застаялай чалавечай бяды, у дажджлівую летнюю ноч Льва пранізліва прабрала надзея.

Перавод у звычайную турму быў цудам: гэта азначала, што бяспашпартны апатрыд Леў Іванавіч Каляда вярнуўся ў прававое поле, дзе магчымы суд, вызначаны тэрмін і ўрэшце рэшт, хай сабе і далёка, — воля. Больш таго, гэта была турма міліцэйская, а не гэбэшная.

Значыць, на волі нешта змянілася.

Пахла тут жыццём, сціснутым сценамі. Наўрад ці гэта нашмат адрознівалася ад духу якой-небудзь сялянскай хаты шаснаццатага стагоддзя, калі ў Бога верыла і малілася Ісусу Хрысту ўся Беларусь.

Цяпер, пасля ўдару Цімура, кожны ўдых — і тленны пах чалавечай смяротнасці ў камеры, і стынь з падвалаў, і рэдкія скразнякі ад дзвярэй, і веянне ветру пераменаў з бразгатам ключоў — даваліся Льву з болем.

Нос, калісьці ягоны гонар, ягоная брама ў духоўны свет, раздроблены, наліты барвова-чорнай гематомінай, цяпер быў праломам у напаўразбураны храм цела. І кожны пах следам за Цімурам біў проста ў мозг. Турэмнае тхло ўваходзіла ў яго, Льва, супраць ягонай волі, бадзялася па ўсіх звілінах, аж пакуль знясіленая галава не пачынала ныць, нахабна ўсялялася ў найдаражэйшыя памяшканні памяці і га́дзіла ў самых таемных і святых закутках.

І ўсё-такі нешта падказвала Льву: дыхай, дыхай глыбей, наапошак. Гэтыя ўдыхі — апошняя Божая ласка табе на зямлі.

***

Крокі спыніліся ля ягонай камеры, забразгаталі ключы. Леў падцяўся і нутрана зарычаў. Акаваныя жалезам дзверы стукнулі ва ўпор на падлозе, і разам з удыхам чыстага паветра з калідора сунулася зусім не постаць прадольнага, а буйная лабатая прымружаная бульбіна. Дарагі шэры касцюмчык з адлівам. Пах скуры з салона аўтамабіля. Парфум. Дымок дарагіх цыгарэтаў. І — нейкі няўлоўны падазроны душок...

Лабатая бульбіна паморшчылася.

— Ваняет у вас тут у камерах, палкоўнік... Э-э, Іваныч... Ты, ну, ты... Пашлі пагаварым.

Леў не даў веры. Ён стрымаў жаданне адправіць гэтага панібрацкага гобліна падалей, бо пазнаў. У смярдзючую камеру «Валадаркі» сунуў свой твар міністр унутраных справаў Рэспублікі Беларусь — Уладзімір Уладзіміравіч Уладзіміраў уласнай персонай.

— Гдзе у вас тут можна пагаварыць?.. Нет, следственны кабінет не падходзіт. Пагаварыць, палкоўнік, вам жа сказалі... У начальніка ізалятара? Харашо, давай да начальніка.

О, гэты дух турэмных калідораў, дзе нуда канваіраў і тленне гніючых целаў перабіваюцца попахам капуснага супа, што памешвае ў кухні баландзёр! Адлюстраванні ў вымытых падлогах з духам каменя, па якіх ступаеш, нібы над безданню!..

Насамрэч высокі візіт папахваў не надта. Льву хапіла пары дзясяткаў крокаў, скарочаных дзеля падбітай нагі, каб зразумець: сюды, у міліцэйскую турму, яго перавялі па волі чалавека, што цяпер ідзе наперадзе і за якім цягнецца густы хвост нячыстых духаў, дарагога жыцця, крыві ды поту, перамяшанага з трайным адэкалонам.


Падняліся ўгару; пачалася чырвоная дарожка; Леў цяжка дыхаў — за апошнія месяцы адвык хадзіць. Светлы пакой з партрэтам Родзіна расхінуў абдымкі скураной канапы ды венскіх крэслаў з выразным пахам сланечнікавага алею.

Алей, знак славы, знак улады.

Уладзіміраў нецярплівым рухам рукі вымеў з пакоя гаспадара, тоўстага каструбаватага чалавека з цёмнымі мяшкамі пад вачыма і пагонамі палкоўніка: Ляксеіч, мы тут самі, мінут дваццаць, — ды паказаў Ільву на канапу.

— Эта хто? — праваліўся ў фатэль насупраць і паказаў на ягоны нос. — Цімур? А-а-а, пахожа на няво. Этат можат.

Колькі секундаў ён разглядаў Ільва, нарэшце крэкнуў (Леў пачуў нават штосьці кшталту шкадобы), падняўся са шлейфам сваіх адэкалонна-скураных пахаў і выглянуў за дзверы:



— Э, Ляксеіч, кофе нам зьдзелай, ладна? І мне, і яму. Пакрэпчэ, тока натуральный, смотры, я растварымы не люблю, туфту эту.

Вярнуўся, зіркнуў зноў.

— Да, атдзелалі ані цібя. Іга манголо-татарскае, беспрадзел.

Нахіліўся. Леў зацяў дыханне, стала душнавата, пукатыя вочы навіслі над ім:

— Ваабшчэ-та мы тваево Цімура за пасьледній месяц немнога, будзем так гаварыць... апусьцілі. Панімаеш, мы паработалі над цем, што-бы аб'явіць вашым амнісьцію. У связі с абшчэственнай значымасьцю. Вашы тут вазбухлі ў Будславе і так далее. Цібя перавялі сюда... очань інціэрэсная ісходыя была, но аб этам патом... павер, рашалась на самам вярху.

Уладзіміраў падняў вочы ўгару. Леў выдатна зразумеў, які верх маецца на ўвазе. На імгненне перахапіла дыханне, у глыбіні душы варухнулася пыха. Для сябе ён адразу паправіўся: канечне, на самым версе — гэта на небе, Уладзіміраў прарочыць, сам не ведаючы.

— Іванавіч... Ты ж паймі. Есьлі без балды, как у народзе гаварат, мы цібя вытащчылі проста із сракі... у этава узкаглазава чорта. На органы он там сабіраўся цібя пусьціць ілі опыты дзелаць, хрэн ево знает, но факт ціпер тот, што ты тут. Маліськ Богу і скажы спасіба. Прычом эта я не проста так здзелал, панімаеш?

Уладзіміраў ледзь чутна, з нетраў, адрыгнуў. Напэўна, добра паабедаў перад гэтай размовай, страўнік нармальна працуе. Леў сцяў дыханне.

— Не думай, што ты для нас ахерэнный герой і так далее. Ты ў сваей жызьні наварацiл, я дасье сматрэл, прэдастачна. І я цібе не ацец радной. Но. Есьць вот этат Цімур, б..., і есьць ево кантора, ісключыцельна врэдаНосная. Ты ево враг. А враг маево врага... ну, панятна. Так вот, он шчас там ссыт кіпятком і роет у вярхах, штоб цібя атсюда забраць назад. Павер, есьлі он заберот, цібе хана, точна. Мне сказалі, он цібя как сабаку ў падвале на цапі дзяржаў. Маньяк. Нос я сам віжу. Так вот, цяпер кішкі вынет. Бамжэй он там разьдзелывает, как бог чэрэпаху, знаеш. Паэтаму давай дагаварымся.

Дагаварымся? Леў пацягнуў балючым носам; разабрацца ў спляценні скразнякоў, духоў, духаў і цяжкога тла было складана.

Пагрукаўся і зайшоў сутулы палкоўнік з пахам гемарою, несучы свае мяшкі пад вачыма і дзве філіжанкі кавы, на спадачках, з цукрам-рафінадам і маленькімі лыжачкамі. Усё гэта дробна дрыжэла, і тонкі срэбны званочак празвінеў для Ільва. Увага.

— Туда стаў, — распарадзіўся Уладзіміраў і бесцырымонна прысунуў столік бліжэй да Льва.

Палкоўнік выйшаў задам, пакланіўшыся. Уладзіміраў нахіліўся яшчэ бліжэй, і разам з пажылым душком Леў раптам пачуў жорсткую драпежную сілу. Мяса. Плоць.

— Ты паможаш нам с этай дзьвіжухай — хто там у цібя, што там, усе дзела.

Дзвіжухай?

Уладзіміраў адкрыў рот, і Льву раптам заняло дых.

— Ты ж, наверна, не знаеш... Ладна, газет за пасьледнія месяцы цібе падкінут, папрашу, разьберошся. Там у Будславе твае сабралі сто тысяч народу і пайшлі галівудзіць па акруге, — Уладзіміраў

перайшоў на шэпт. — Вот штоб узялісь, у адзін кулак, і на Мінск… Чо смотрыш, як сыч, я це гавару, как есьць, урацъ не буду. Народ вазбудзіўся, тут толька сьпічкай чыркні, палыхнёт. Рэфармацыя ілі дэфармацыя, сматрыце там па вашым паняціям бажэственным самі. Пагрузіліся на транспарт і ў сталіцу. Адну ноч вашым даю. Цэнтр горада. Дварэц ево, башню, целецэнтр у Галерэі… Мы свой квартал і прэзідэнта ахраняць будзем. Вакзал, камунікацыі і таму падобнае не трогайце, а ево рабят і Каміцет масай задавіце. Сагласен, нет?

Кава, сапраўдная, ядраная бразільская кава, зыходзіла хатняй утульнасцю. Яна абуджала водар цёплай размовы дзе-небудзь у Менску вечарком, брацкай рады пасля набажэнства ў нядзелю, апошняй гадзінкай перад чытаннем Бібліі і малітвай нанач. Гэты пах грукаўся ў скроні, блытаўся ў яго ў барадзе, аж да завіткоў, увільгатняў вусны і ўладна паланяў голаў.

— Еслі бы ціпер народ, каторы вас паддзержывает, каторы ходзіт с крэстамі, с флагамі, і так далее, — голас Уладзіміра ваў яшчэ цішэйшы, ледзь чутны, але ў ім Леў чуў дыханне шматтысячных грамадаў, — ты слышыш, еслі б он, і я знаю, многія тут думают а том жа… еслі б грохнуў эці канторы, как тагда ў Полацку… Паймі, тут ніхто бы не стаў нічога ніякага… Панімаеш?

Шэпт шыўся, крышыўся, курыўся. Запахла паленым.

— …Усе ево філіалы, у нас, за граніцай і так далее. На цібя і тваіх ужэ угалоўных дзел… у меня сейф забіт. Ціраць цебе ўсё раўно нечага, адзін хер. Так вот, пасмотрым, так сказаць, пад другім углом. Тваі прэкрашчают гнаць на прэзідэнта, на міня, на міліцыю… на цэркаў нашу, праваслаўную ў смыслле, тожа папрасілі. І глаўнае — разносят эту ўсю херню. После этава, сматры, тока после этава — мы даём вам сваліць. Сколька скажэш, людзей вазьмёце, паімённа, выпусцім — хоць у Літву, хоць у Маскву, у Крым, у Рым, куда хочаш.

Лоб Уладзімірава навіс глыбай. Кропелька пота блішчэла на скроні. Пот. Пот. Грэх. Кроў у сэрцы Льва ўжо закіпела ад паху кавы, але ён не варухнуўся.

— Чэво кофе не п'еш? Брэзгуеш? Зра. Нічэво кафеёк.

Уладзіміраў адкінуўся, адхлябнуў і нечакана падміргнуў Ільву.

— Паймі, то, чэм вы занімаецесь, у каком-та родзе палезна для гасударства. Проціў алкаголя, цэркаў, сям'я, цэннасці і так далее. Усё такі есьць вешчы, на каторых зямля дзержыцца. А эці, чучмэкі чорныя, ліберасты і ўся жыдава, каторую он прытаўшчыл сюда, сумашэдшыя бабкі плоцiт — эта паразіты, сукі, сасут с народа кроў, іх… вытравіць атсюда нада. Нахера весь этат трэцій інтэрнацыанал, мы тут самі с усамі. Панімаеш, Іваныч. Я ж тут вырас і прожыў жызьнь. Я не хачу, как і ты, штоб Беларусь перастала быць Беларуссю.

Леў дыхаў глыбока і разумеў: зараз не хлусіць.

Калі чалавек хлусіць, ягоны дух трымціць. Дрыжыць перад Богам. Веруе і трымціць, як той бес з паслання апостала Якава. Леў адчуваў гэта заўсёды, адной слізістай. І непрыемны, горкі пах поту. Мозг ягоны, бы студзень, таксама пачынаў дрыжэць ад агіды. Не, падобна, зараз міністр не хлусіў. Але іншы пах, даўкі, прагорклы, з рота насупраць так і пёр.

— …Панімаеш? С расіянамі да, атдзельна разьберомся, усё-такі мы брацья, хто б там што не гаварыў. А шушару эту вэк.

Уладзіміраў проста тхнуў уладай. Лёсы на мыску языка. Крокі, што аддаюцца ў вечнасць. Самадавольнае пацмокванне пасля кожнага каўточку кавы.

— Но сядзецъ пака будзеш тут, для тваей жа бязапаснасьці.

Думае, што гэтая кава распусціць у кубку кіпеню ягоную волю, як драбочкі цукру. Што пах дажджу, які прабіваецца з форткі, з волі, размые скалу, на якой ён пабудаваў сваё жыццё. Што разамлелае цела пацягне яго на дно. Леў нават чмыхнуў носам.

Уладзіміраў глядзеў на яго, і алей будучай славы, улады, магутны тлушч пераможна блішчэў у ягоных вачох. Як жа змешваліся, віліся, танчылі, клубіўся вакол яго зараз духі — і чэрці, і анёлы!.. Калі б звычайны чалавек бачыў тое, што чуў Леў, ён жахнуўся б ад відовішча дымнай гары, якая перасоўваецца разам з ім.

О, ён моцны, гэты Уладзіміраў. Ён мацней, чым бразільская кава начальніка Валадаркі. Якая горыч уліваецца зараз у сэрца згары, з горла — і якая гарачая слодыч расцякаецца ад сэрца па целе!

— Дайце мне напісаць ім. — Львіны голас, слабы, хрыплы, крохкі, спалохаў яго самога. — Тое, што мне трэба. Праз прэсу. Убачу ў газетах — паверу.

Уладзіміраў набычыў галаву, хмыкнуў.

— Не выкабенівайся, Іваныч. Урэмені нет. Да і выбара у цібя, как ты панімаіш, тожа.

— Выбар у мяне ёсць.

— У смысле, што ты можэш не сагласіцца? Назад к Цімуру хочэш? На цэп?

— Магу і на цэп.

— Какіе вы ўсе недаверчывыя… Думаеш, падстава? Я цібя выташчыў, а ты мне… Ладна. Пару дней ешчо есць. Вабшчэ-та пісьма ў нас можна, еслі што. Тока еслі чэраз прэсу — без рэвалюцыонных эціх прызываў, ну ты поняў. Сам пракантралірую, чэраз спецчасць. А то міня тут умесце з табой… Пра што мы гаварылі — нада па-ціхаму, ты ж панімаіш…

***

Леў удыхаў пах гарачай аўсянай кашы і перапечанага валадарскага хлеба. Пяшчотна, як дзіця, па каліўцы пеажоўваў разбуранымі зубамі і языком зерні. Заплюшчваў вочы перад закратаванай форткай і ўцягваў праз перагародкі раструшчанага носу паветра з волі.

Дрыготкімі ад немачы і хвалявання рукамі ён перагортваў газеты, якія ў абед моўчкі сунулі яму ахоўнікі ў кармушку. Пах газетнай паперы, не бачанай год, пах свежай фарбы разам са старонкамі калыхаліся перад ім, ён дыхаў і не мог надыхацца. Лагчына Нямігі, якая плыве людзьмі. Бездань пагаслага Віцебска са свечкамі — з далёкім, пранізлівым пахам дыму. Пагоня па бруку Навагрудка.

Перад вачыма калыхаліся дзясяткі і сотні тысячаў беларусаў, якія плачуць і моляцца ў касцёлах, плывуць шырокай ракой па вуліцах Вільні, запаўняюць бел-чырвона-белымі сцягамі Паклонную гару ў Маскве, штурмуюць каменную аграмаду Мальбарку.

Пэўна, так пахлі Скарыну першыя надрукаваныя аркушы Бібліі.

Удых. Выдых. Удых. Божа, якая насалода! Дай дыхнуць яшчэ.

Белазор на каленях каля Вострай брамы. Ксёндз Пётр вядзе імшу перад касцёлам у Зарэччы на дзесяць тысячаў чалавек. Ян Ясны спявае пад гітару хрысціянскі гімн каля віленскай Ратушы, перад ім, колькі ёсць плошчы — народ. І нарэшце — Будслаў. Тысячы і тысячы беларусаў у белым.

І пах хлеба — нават з газетных старонак.

Якія прыгожыя людзі, калі дыхаюць Богам!

Пра сябе ён не знайшоў амаль нічога. Агулам пра вязняў згадвалася мімаходзь. Патрабуюць вызвалення. Усё слушна: маладыя маюць расці, а ён малец.

Далі паперы. Пішы.

Пах чыстай паперы — свежы, светлы, дзявочы — даводзіў яго да слёзаў.

Леў соп, цяжка варочаў скалечанымі пальцамі на турэмным століку ў камеры і п'янкім чарнілам шарыкавай асадкі сцякаў на бель увесь, да апошняй кроплі.

***

Мяжа, што аддзяляла той свет ад гэтага, мела выразны пах жалеза. Зараз Леў чуў, як скрыгаталі ключы, як гахалі абабітыя металам дзверы (быццам удар





у галаву), і нават міска, што блікавала на сталe, прыцэльвалася сярпом у ягоную шыю гэтай жа вострай, захапляючай, аж казытала ноздры, мяжой.

Заскрыгатаў ключ, і яркая-яркая стужка святла з пахам волі ўспыхнула ў дзвярах.

Прагулка. Яго выводзілі на прагулку!

Пераступаючы слабымі зусім нагамі, па паўкроку, Леў трымаўся за сценку. Вертухай спачатку цішком, скрозь зубы, а потым і ўголас, матам, пачаў пакрыкваць на яго з выбухам раздражнёнага смуроду.

— Чаго ты крычыш. Не магу хутчэй. Ногі.

— А преступление совершать ноги нормальные былі!

Леў матляў галавой, стараўся, цяжка дыхаў — і лавіў пахі раструшчаным носам.

Страх. Грэх. Страх. Трохі эфіру скразнячком, хтосьці ў хаце моліцца. Тут, напэўна, збівалі кагосьці на калідоры, ясны попах крыві ад сцяны. Далей цяжкі, даўкі дух. Відаць, сядзіць той, хто душыў чалавека. Стары замак, за дзвесце гадоў набрынялы духам сцятага зла, аддаваў усе пахі беларускай нянавісці, цярпення і халоднага пекла.

Калі канваір вёў яго міма камераў смяротнікаў, у насаглотку шыбанула пахам крыві. Той самай крыві, якая вапіе да Госпада.

Льва перасмыкнула. Сэрца забілася.

У запляваным бетонным дворыку Леў задраў твар угару і моўчкі, з заплюшчанымі вачыма, піў неба. Каўтаў, захлёбваўся, мармытаў малітву, выціраў слёзы і стараўся не ўсхліпваць, каб вартаўнікі не чулі. Сонца залаціла краі калодзежа, закратаванага сеткай, і мох на камянях пахнуў верасовым мёдам.

***

На трэці дзень пасля таго, як ён аддаў напісанае «Слова пра Любоў», вечарам, пад натхняльны пах бульбянога супа з бачка баландзёра, яго зноў павялі ў кабінет начальніка.

Уладзіміраў стаяў перад вакном са стосам газетаў у руках.

— Усё как дагаварываліcь. Любоў, мне самаму панравілась. Можаце ж і мірна, і па-харошаму, кагда захаціце. А кагда нада — і ў морду.

Газеты былі шмякнутыя на стол, і Льва абдало хваляй свежага ветру і друкарскай фарбы.

Загалоўкі былі як каўткі віна нагбом. «Леў Каляда жывы і піша пра любоў», «Послание Льва беларусам», «Новае слова з Валадаркі», «Белорусам — с любовью».

— Ну што, Іваныч. Я абешчал — я зьдзелал. Ціпер ты.

Леў дыхаў, гартаючы старонкі, і ліхаманкава стараўся запомніць усё, што мільгала вакол ягонага Слова. Цімур Баальбекаў пра Белазора: «Подонок з чёрной душой». Выказванні кардынала Джузэпэ Пелегрыні наконт памылак у веравучэнні руху беларусаў. Плач з касцёлаў перакінуўся на цэрквы.

Нарэшце ён падняў вочы на Уладзімірава і выдыхнуў яму ў твар:

— Мы не будзем з'яджаць. Гэта наша зямля.

Уладзіміраў папярхнуўся і хвіліну моўчкі з крывой усмешкай глядзеў на яго. Пахнула пыхай.

— Не хочаш па-харошаму, значыт. Ну есьлі так, тагда будзеш сядзець. На радной зямле. Нет вапросаў, Іванавіч. Зра я цібя сюда выташчыл.

Леў дыхаў на ўсе грудзі і ўдыхаў з дзвярэй волі, якія для яго зараз зачыняцца назаўжды.

— А ведаеш, Уладзімір, што сказаў Ісус, калі яго арыштавалі і прывялі да начальства, каб асудзіць на крыж?

— Ну і што ён сказаў?

— Нічога.

Уладзіміраў зморшчыўся, як быццам смярдзела зараз ад Ільва:

— Ты хочаш сказаць, што абдурыў міня? Я правёў у СМІ эту тваю чуш, штоб ты пасмяяўся? Хрысціянін такой, да? Я табе паверыў, как мужык мужыку…

— Я нічога не абяцаў.

— Кароча, панятна. Фарысеі вы і езуіты, опіум для народа. Нікагда ат вас народу пользы не была і не будзет. Поняў я цібя. Сматры сам. Я прэдупрэждаў…

Чалавечыя сны

З нізкі «Ваўкалак»



Ігар СІДАРУК

Ваўчаняты

За цаглянаю кладкай —
Мае ваўчаняткі.
Іх вачаняткі
Мёртвыя?
Па аорце —
Ужо не вадкая,

А захраслым бітумам
Кроў.
Зноў
Іклы помстаю
Спрэс налітыя;
На сто бітых —
Чатыры нябітыя.
На раць стрэльбаў —
Дзесяць галоў.

Нашых, аднак.
Нашых.
За якія парву, аднак.
Ды звяду
На апошнюю паршу,
Я — ваўкалак.

Мёртвыя дзеці

Я сваю скуру
Раздзяру ранкам,
Расцялю роўна,
Каб дастаць сэрца
З-пад сухіх рэбраў.
Вось яно: парай
Пасярод скуры,
Пасярод лесу;
Ваўчынаю фарбай:
Чырвоным на белым.
Чакай: шэрым!..
Як мая скура,
Як маё неба,
Як мае вочы —
Дзе сёння — смерць.
Дзе ўчора — смерць.
Дзе мёртвыя дзеці
Разарвуць сэрца.
Маё — вось гэта.
І падмацуюцца.
І абернуцца сонцам,
Заходнім сонцам,
Што ў вачадолах
Чорным зыркім вуглём
Застанецца.
Як вера. Як помста.
Як жыццежах.

***

Я — ваўкалак.
Аднак
Яшчэ —
Чалавек.
Рэк
Замарожана процьма.
У роце
Горыч.
Сволач!
Што ж ты робіш, сволач?!
Чаму
Ноччу
Страляеш улёт?..

Норд
Дзьме ў пысу;
Чалавек,
Усміхніся!
Аднак,
Я — ваўкалак!

У маіх кіпцюрах
Жах
Для тых,
Хто б'е пад дых
Ды рве
Цягніцы.
Зарыцца!
У мох.
У нару.
Здохну.
Пампу.
І — абярнуся.
Бо я — застаюся.
І паўстану, аднак.

Бо я —
Ваўкалак.
Бо я —
Чалавек.
Што ў новым жыцці —
Як здзек.

Навек.

***

— Я толькі хацеў сказаць.
Я толькі хацеў паслухаць…
— Сядзь.
Завіруха.

— Чую, каханая, чую.
Так і тады было.
— Час — куля.
Прайшло.

— Што ж, мінулае прэч.
Толькі яшчэ надзея…
— У ночы
Калее.

— Бліжэй да агню пусціш
Хоць на хвіліну зноў…
— На вуснах
Кроў.

— Сваімі спыню. Голад
Прагне тваіх даўно.
— Холад
Ў вакно.
І месяц ляціць на дно
Ночы…

— А хочаш?
— Ноч — хлеб наш сірочы.
Маўчы.

Чалавечыя сны

Мне сёння сніўся чалавек.
Што раптам без ваўчынай скуры
Паўстаў скрозь шэры брудны снег,
Стаяў насупраць і не бег, —
Адно глядзеў наўпрост панура.

І я тады ў яго спытаў:
«Чаго ты хочаш, чалавеча?».
І ён сярод калючых траў
Зваліўся і заскавытаў,
Як звер, выцём сваім адвечным.

А потым снег халодны жэр.
Нібы ў жыцці не еў ніколі.
«Я — чалавек! Не людажэр.
Мой брат, прашу цябе, павер!»
І косткай храсла рэха ў полі.

З-пад снегу ён тады дастаў
Дзіця. Не мёртвае. Жывое.
І пад сасцы мае паклаў.
І зверам зноў заскавытаў,
Нібы душу мне аддаваў.



І чорны снег — смактаў, смактаў;
Як і мяне — яго малое.

***

«Мяса дай, мяса!» —
Пішчаць шчанюкі.
Рэжу ім, ласым,
Часткі рукі.

Дакладней, лапы.
Разглядзець як?..
Я сёння вой
Ці ваўкалак?

Пуста ў люстэрку.
І толькі поўсць —
Як сімвал веры:
Збылося!

Таму й ваўчаняты
Пішчаць дасюль,
Што бацька — закляты.
Няўжо й ад куль?!.

Што ж, паляўнічы,
Страляй — не страляй:
У такім абліччы —
Ваўчыны рай.

Вось толькі малятам
Тыя чары — як дым.
Іх усіх зухавата
Б'юць па адным.

Яны ж — ад ваўчыцы.
А я — ваўкалак.
Тых куль не пазбыцца
Ім аніяк.

Таму шлях іх адзіны —
Ў ваўчыны рай.
Енчуць, нявінныя:
«Дай мяса, дай!».

***

Вечарэе. Пахне мятай.
Цені. Ложак. І адзенне —
Раптам знятым, здзертым, змятым —
На падлозе. Пад каленьмі —

Сэрца. Грукае няўклюдна;
Як і рухі. Непазбежнасць
Нас даймаць да рання будзе.
Да адчаю. Да бязмежжа.

Да апошняй тонкай рысы,
За якою — нагадаю:
Нам адзіным будзе выйсцем —
Дэпартацыя прэч з раю.

Куля

У люстэрку — чорны воўк.
Хіжая пыса.
У лапах — вінтоўка.
Маліся,

Што ты — не чалавек.
Што я — не ваўчына.
Ні цурбан, ні калека.
Стрэл. Міма!

Ні ў люстэрка, ні ў скронь.
Брудная куля
Вые агоніяй
У рулі.

Яшчэ міг, яшчэ крок —
Жахне да бесу.
Трапна ў вока
Цэлюся.

Гэты енк, гэты жах —
Бы пад капірку.
У нашых ілбах —
Дзве дзіркі.

***

Вантробы — на снезе.
Не птушак — мае.
Дзень антытэзай
З ноччу пяе

Рэквіем змрочна
Соснамі ўвысь.
Хто сцежку сурочыў?
«Дзяржысь!»

Там, за палянай…
Далезьці, дапяць…
Калі выць не ў стане —
Не спаць!

Пячонку ды кілы
Ў кучу зграбу.
Астатняя сіла —
У збітым гарбу.

Нікуды не дзецца…
На камні — татэм.
Каб крышку сагрэцца —
Я ўласнае сэрца
Ем.

***

Дрэвы-свечкі — не з парафіну.
А са снегу і з нашае скуры.
З тых шурпатых і прывідных ліній,
Што свідруюць прыцемкі бурам.

І збіраюць подых далёкіх
Іншасветных, як сон, чалавечкаў.
Сёння лепей не лётай высока —
Штармавы абяцаюць вечар.

***

Пахне вечнасцю поўсць.
У нары
Чалавеча — мой госць.
Жары!

Не бойся, ягня не скраў —
Забіў
Хворае сярод траў.
З губы

Тлушч і свой страх зліжы.
Павер:
Воўк чалавеку зблізу —
Не звер.

Хоць розны ў вачах
Агонь,
Сцісну тваю без жаху
Далонь.

Іклы зернем з раллі
Ўкладу:
Будзе мне воўкам, калі
Пайду…

Я. Ты. І Маўглі



Кацярына ФЯДОТАВА

«Я не ведаю, як цябе завуць і як ты выглядаеш, п'еш уранку каву з вяршкамі або без, снедаеш або не, прачынаешся рана або пасля палудня... Усё гэта не важна. Галоўнае тое, што калі ты не прыедзеш да мяне да Новага года, я скончу жыццё самагубствам. І гэта не пагроза, не вымагальніцтва, не блеф. Так і будзе. *Я* праглыну жменю лекаў або сяду на падваконне і сігану з пятага паверха... *Або яшчэ як-небудзь* сыду з гэтага свету, дзе нікому няма да мяне справы. Не трэба мяне шкадаваць... І ты павінен прыехаць не дзеля таго, *каб свет не паменеў на адну* бессэнсоўную істоту, а дзеля сябе...»

Гэты ліст быў сямнаццатым па ліку ў калекцыі Лёніка. Мужчына старанна склаў яго і запіхнуў да іншых. Да Новага года засталося мала часу.

«...у пяць гадоў я навучылася чытаць і пісаць. Сама. Бацька толькі літары паказаў. Я доўга глядзела на іх і пачала складаць словы. Адзіную кнігу, што была ў нас дома, я памятаю і сёння — «Маугλі». *У пяць* гадоў было яшчэ адно адкрыццё — Мароз прынясе падарунак, але перад гэтым трэба напісаць яму ліст. Тады я папрасіла, каб Марозператварыў мяне ў сінічку і я магла лётаць да бабулі ў вёску. Перад самымі Калядамі так і здарылася — я стала сінічкай і паляцела да бабулі. Ты падумаеш, што я вар'ятка... Не, ты мяне зразумееш, з табой таксама такое было. Толькі ты быў спрытным лісам або драпежным ваўком. Сінічка-невялічка і ваўчок-шэры бачок. Як у казцы...

На белым абрусе чырвоныя літары ХН, гэта значыць Хрыстос Нарадзіўся. Бабуля іх вышывала сама. Гэты Хрыстос — добры чалавек, шмат пакутаваў, таму яго трэба шанаваць.

Абавязкова трэба з'есці тры лыжкі куцці і толькі потым смажаную каўбасу. Магчыма, ты зусім інакш сустракаеш гэтае свята. Калі ты да мяне прыедзеш, то раскажаш, як...»

Інтэрнат. Пакой трыста тры. Два ложкі, стол на хісткіх нагах, два табурэты і ўбудаваная ў сцяну шафа, падзеленая на дзве паловы. Біпалярнасць ва ўсім свеце. Толькі яе Сусвет монапалярны.

Марынкі, прыгажуні-суседкі, няма. Цёмна. Не распранаючыся, не запальваючы святла, дзяўчына залазіць пад коўдру і сцішваецца. А што, калі ён так і не напіша ёй? Сапраўды трэба будзе памерці? Светка дакранаецца да сваёй шыі — цёплая. Пад скурай б'ецца кроў — гарачая. Напіша.

Убегла Марынка. Шчоўкнула святло і спуджана войкнула:

— Светка, ё-маё! Напужала! Чаго ты тут сядзіш у цемры?

— Грэюся...

— Змерзла? Ну-ну! Ну што, атрымала?

Светка толькі глыбей залезла пад коўдру.

— Я табе казала, што ўсё гэта лухта! Ніхто і ніколі табе не адкажа! Гэта немагчыма! Так усё жыццё прачакаеш пад коўдрай сваёй і памрэш пад ёй! Табе замуж трэба! Колькі гадоў табе?

— Трыццаць два.

— Трыццаць два?! — Марынка прысела на свой ложак. — Мне дваццаць пяць! А я ўжо старая!!! Я ўжо не вытрымліваю канкурэнцыю! Цяпер сама ведаеш, якія дзеўкі! Трэба спяшацца, адпавядаць часу! Разумееш?

Светка маўчыць...

У краме шмат народу. Вялікі тоўсты мужык у бабровай шапцы і штучным футры набірае поўную сумку ежы. Кожны раз, як Леанід спадзяецца, што чарга пасунецца ўперад, мужык успамінае, што не ўсё купіў. У бяздонны сумцы знікаюць тлустыя селядцы, аліўкі ды іншая ежа, прызначаная да святочнага стала. Старэнькая бабулька ў пуховай хустцы доўга круціць у руках каўбасу, пытаецца, ці смачная, колькі ляжыць у краме, але так і не бярэ. Маладзіца з белымі валасамі перад Леанідам просіць шампанскага і цукерак, і мандарыны, і ананас, канешне, як жа, ледзь не забылася.

Нарэшце даходзіць чарга да Лёніка, ён сумна глядзіць на прадавачку, тая стомлена на яго.

— Як звычайна.

Без слоў жанчына перадае буханку чорнага хлеба і пакет малака. Закінуўшы ўсё ў паштовую сумку, мужчына выходзіць з крамы. Вецер гуляе з рэдкай гірляндай, неахайна кінутай на вітрыне. Са сметніцы цягне смуродам запаленага пакета: нехта кінуў непатушаную цыгарэту. Мінае пустую плошчу з самотнай елкай, на якой гайдаюцца папяровыя чырвоныя ліхтары, будынак райвыканкама.

Дома налівае ў шклянку малака, адразае лусту хлеба, дастае з кішэні ліст.

«...у нашым горадзе не выпадае снег. А калі і выпадае, адразу ператвараецца ў ваду. Гэта сумна. Калі мне было дзесяць гадоў, *бабуля ўпершыню адпусціла мяне на школьную елку. Перад гэтым мы рабілі мне карнавальны касцюм. Яна хацела, каб я была сняжынкай, а я хацела быць Ма*ўглі. Бабуля сварылася, *потым угаворвала, але я была Ма*ўглі. Я ўпотайкі абстрыгла валасы і намазалася сажай з печы. Бабуля сказала, што я зусім ненармальнае дзіцё і невядома, як я пражыву, калі яна памрэ. Нармальна. Тады было шмат снегу. Пакуль я дайшла да школы, *сажа сцерлася, а бруд застаўся*. Настаўніца музыкі памыла мне твар, завяла ў клас і абкруціла бліскучым дожджыкам. Але я Маўглі! Ён не ведае, *што такое дожджык*...

Ты наш і не наш, з джунгляў і не з джунгляў, — казала Багіра, — а я ўсяго толькі чорная пантэра, але я люблю цябе, Маленькі Брат.

Я люблю цябе... Я ніколі не чула такіх слоў. Мне ніхто іх не гаварыў, ніколі... Таму, калі ты не прыедзеш, мне няма больш сэнсу жыць...»

Першы ліст Леанід атрымаў, калі яму было дваццаць пяць гадоў. Ён, як звычайна, разбіраў пошту і сярод лістоў мясцовага накірунку і паштовак убачыў канверт, на якім быў пазначаны дзіўны адрасат — горад Нью-Йорк. І больш нічога. Што за дзівацтва! Няўжо не зразумела, што ніколі ліст з такім адрасам не выйдзе за межы нават гэтага будынка. Нешта прымусіла Леаніда затрымацца і не кінуць ліст у зварот, можа, таму, што быў пачатак снежня, глыбокі вечар, на пошце нікога... Хлопец акуратна адкрыў канверт. З яго выпаў невялічкі аркуш, спісаны роўненькім дзявочым почыркам. У ім невядомая прасіла прыехаць і забраць з сабой у самы прыгожы на зямлі горад. Леаніду стала смешна. Ліст ён схаваў у журнал уліку, а сам паспяшыў да хаты. Там чакала прыгажуня-жонка.

Праз год Леанід зноў знайшоў такі самы ліст, але адрасам значыўся горад Дублін, самы хара́ктарны на зямлі. Ён узяў абодва лісты з сабою, каб паказаць жонцы. Тая доўга смяялася.

Яшчэ праз год прыйшоў трэці ліст, накіраваны ў Парыж, самы рамантычны горад свету. Жонка сказала, што трэба здаць гэту аўтарку ў дурдом, і нават хацела прачытаць зваротны адрас, каб дапамагчы зрабіць гэта. Лёнік не даў, схаваў ліст у кішэню, за што быў абазваны дэбілам.

Потым былі яшчэ Рым, Лондан, Піцер і Масква, Пекін... Дзесьці на аўстралійскім Канберы ад Леаніда сышла жонка. На шчасце, Закон Джунгляў навучыў Маўглі стрымлівацца, бо ў Джунглях ад гэтага залежыць жыццё. У эпоху Вены Леанід амаль напамяць ведаў Маўглі.

«...ясна, што кожны воўк пасля таго, як завядзе сям'ю, можа пакінуць сваю чараду. Бацька ажаніўся зноў і ўспомніў, што ў яго ёсць *я*. *Мне было дванаццаць гадоў, калі мяне зноў забралі ў горад, як казала бабуля, дзеля метраў. Тыя самыя метры спатрэбіліся новай жонцы, каб атрымаць большую кватэру. Там, паміж прыбіральняй і пакоем сына бацькавай жонкі,* была невялічкая камора, без вокан, *дзе я* і пасялілася. Ведаеш, гэта добра, што я маленькая, а то б мае ногі заўсёды тырчэлі з тапчана і ўпіраліся ў дзверы... *Ты,* канешне, хочаш ведаць, якая я... На жаль, у мяне няма фота, каб паслаць... Але я магу сябе апісаць. Я непрыгожая — *нос бульбінай, вочы вадзяніста-*шэрыя, валасы рудыя, на твары рабаціннe. Яшчэ я страшэнна худая. Бабуля казала — адны шчэлепы. І малая. Але я вельмі моцная і вынослівая, бо закон Джунгляў гаворыць, што слабы будзе з'едзены. І калі ты прыедзеш, я абавязкова буду цябе ахоўваць...»

— Паслухай, Светка, пайшлі са мной! — Марынка прысела побач. — Усё-роўна, калі і прыйдзе твой ліст, то толькі заўтра. Лёнік пошту ўначы не панясе!

Светка гэта ведала, але адмоўна пахітала галавой. Тэлефон заспяваў вядомую калядную песню, і Марынка спахапілася:

— Усё, не магу цябе больш угаворваць! Віталік прыехаў! Там у шафцы варэнне бяры, мамка перадала мне, а я салодкае не ем, ты ж ведаеш. У мяне фі-гу-ра...

«...калі мне было пятнаццаць, я знайшла бацьку ў ванне з чырвонай вадой. З таго часу я не чую паху. Зусім. Гэта дрэнна і небяспечна. І тады я вырашыла выбрацца з Джунгляў і напісала табе першы ліст, *але ты не адказаў*... Бабуля сказала, што ёй таксама нядоўга засталося, *і т*аму я павінна вывучыцца і кімсьці стаць. Яна не хоча зразумець, што я Маўглі! І не магу быць іншай... Але я не хацела крыўдзіць яе і стала пекарам. Бабуля ўхваліла, *сказала, што цяпер я ніколі не буду* галоднай. Я пяку хлеб. Чорны. Кожны дзень. Ты любіш чорны хлеб? Я б хацела, каб любіў... Я б табе кожны дзень яго пякла — цёплы і духмяны... Я не памятаю, як ён пахне... Я не чую пахаў. Калі ты прыедзеш да мяне, ты раскажаш мне, як пахну я. *Мне здаецца, што малыя і худыя людзі пахнуць чорным хлебам, а тоўстыя* — белай булкай. Не люблю белы хлеб...»

Увесь снежань і студзень, і люты, і палову сакавіка, і калі-нікалі ў красавіку Леанід бачыць Свету, што стаіць насупраць пошты. Кожны раз, як праходзіць з паштовай сумкай каля яе, ён апускае вочы і толькі адмоўна хітае галавой — нічога няма. Света ўгінаецца і ча́пае дадому. Лёнік доўга глядзіць ёй услед. У кішэні ляжыць стос туга перавязаных лістоў.

У пакоі ціха працуе тэлевізар. У рэкламе хлопчык знайшоў пад вялікай елкай падарунак, спакаваны ў бліскучую чырвоную паперу з залатым бантам. Лёнік не любіць Новы год, як і ўсе астатнія святы. Да Новага года застаецца пяць дзён. Праз пяць дзён яе не стане, і свет паменее яшчэ на адну бессэнсоўную істоту.

«...*у* горадзе, дзе я жыву, ніхто не сустракае Каляды і Новы год па-сапраўднаму. *Аднойчы я хадзіла ў кіно і бачыла,* як гэта трэба рабіць... У мяне няма сваёй Чарады... А ў тых, у каго ёсць Чарада, няма разумення...

Калі ты прыедзеш, мы абавязкова паставім жывую ялінку і ўпрыгожым яе чырвонымі і залатымі шарамі, а потым засцелем на стол белы абрус з чырвонымі літарамі ХН(гэта адзінае, што я ўзяла з бабулінай хаты, калі яе не стала) і зварым Куццю. Гэта такая каша з цукрам і разынкамі. На жаль, у мяне няма печы, але мы можам сесці на ложку пад коўдрай і піць гарбату, а калі гадзіннік праб'е дванаццаць, мы павінны падарыць адно аднаму падарункі. Мой ліст атрымаўся вельмі доўгім... Гэта таму, што калі я пішу, то як быццам размаўляю з табой, а скончу ліст — і зноў застануся адна... Быць адной дрэнна... Ніхто не павінен быць адзін...

P.*S. Гэта апошні мой ліст* да цябе. Калі ты ёсць — ты прыедзеш, калі цябе няма — мяне няма таксама.»

Звесіла ногі з ложка. Села. Праз пяць гадзін прыйдзе Новы год, праз пяць гадзін трэба будзе памерці.

У цішыні і цемры прыслухалася. Нехта ідзе па калідоры. Стаіўся. Сэрца страшна закалацілася. Ціха-ціха пастукалі.

— Не замкнута.

Перад Светкай стаіць паштальён Лёнік.

— Прынёс?

— Ага.

— Дзе?

— Хадзем.

«Я абяцала больш не пісаць, але звычка — упартая рэч. Я буду кожны год слаць табе лісты і гаварыць у іх, як кахаю цябе. Я ніколі не забуду наша першае свята. Як доўга мы ішлі па пустых вуліцах, і ты трымаў мяне за руку, як адчыніў дзверы, і я ўпершыню за шмат гадоў адчула пах. *Пах жывой ялінкі. З*амест чырвоных і залатых шароў мы падвешалі на яе яблыкі і мандарыны, а на стол паставілі Куццю. *Я ніколі не забуду,* як разгарнула чырвоную бліскучую абгортку з залатым бантом і ўбачыла старую кнігу ў зялёнай вокладцы з вялікімі літарамі «Маўглі» і стос маіх лістоў да цябе, роўна сямнаццаць...


Памятаю, што якраз апоўначы выпаў снег. Як доўга мы яго чакалі... А потым змерзлі, залезлі пад коўдру і пілі гарбату з варэннем Марынкі..

Мы называем нашага сына Маўглі. На шчасце, ён падобны да цябе, бо я такая непрыгожая... Але ты заўсёды гаворыш, што мае вочы шэрыя, як азёрная вада, а валасы — як спелае жыта, а ўсё разам — гэта хлеб. Ты заўсёды любіў чорны хлеб».

Васіль Быкаў: «Усё жыццё я

Гутарка з народным пісьменнікам Беларусі Васілём Быкавым адбылася ў траўні-чэрвені 1995 года і, несумненна, найперш была абумоўленая часам, які перажывала Беларусь.

А час той вызначаўся многімі змрочна і нават роспачна: 14 траўня прайшоў ініцыяваны прэзідэнтам рэспубліканскі рэферэндум, на які сярод іншых было вынесена пытанне аб мове: ці мець расійскай мове роўны статус з беларускай (г. зн. дзяржаўны)? Большасць адсоткаў выбаршчыкаў ад тых, што ўзялі ўдзел у галасаванні, выказалася станоўча па тым пытанні... Як і наконт эканамічнай інтэграцыі з Расіяй, і змене нацыянальнай (!) сімволікі на новыя, насамрэч — старыя, трохі падпраўленыя сімвалы савецкай Беларусі... Так ці інакш, у грамадскім жыцці адбыўся чарговы крок назад: ад няпэўнай, няўстойлівай, вельмі абмежаванай паслясавецкай дэмакратыі да сумніўных каштоўнасцяў і сэнсаў існавання — як паасобных людзей, так і нацыі ў цэлым...



— Сёння многія скептычна ацэньваюць савецкую літаратуру, яе феномен. Скажыце, калі шчыра, — проста па-чалавечы Вы задаволены тым, што ўдалося зрабіць у літаратуры асабіста Вам?

— Вядома, не задаволены. Мабыць, дужа шмат творчага часу патраціў на банальныя, як цяпер пагляджу, рэчы: вайсковы гераізм, які быў не болей чым часткай (і не найбольшай) вялікай вайны, на яе пакутнікаў і яе вялікае бязладдзе. А між тым, ёсць яшчэ не меней драматычныя перыяд нашай навейшай гісторыі — 30-я гады, як след не распрацаваныя нашай літаратурай (хіба адзін Мележ). Але час упушчаны, і цяпер гэта ўжо — Атлантыда, што ўсё болей хаваецца ў нябыт. Хто яе падніме на паверхню памяці? Старэйшых пісьменнікаў ужо няма, адны адышлі з гэтага свету, іншыя свой талент аддалі іншым праблемам — ачмурэнню класавай барацьбы, звыродлівым фантомам сацспаборніцтва, прапагандзе партыйных догмаў, якія шмат каго тады захаплялі. Для маладзейшых 30-я гады — тэрра інкогніта, наўрад ці яны ў ёй як след разбяруцца, хоць і глядзяць на сваіх папярэднікаў паблажліва, звысока. Мабыць, некаторым здаецца, што яўнае калабаранцтва старэйшых ішло ад невуцтва, светапоглядавай абмежаванасці. У той час як усё было болей проста і болей страшна. З тагачасным камуністычным таталітарызмам, паводле слушнай заўвагі Альбэра Камю, можна было або супрацоўнічаць, або змагацца. Пісьменнікі, як вядома, кепскія змагары. Значыць, што ім заставалася? Адно супрацоўнічаць, калі яны хацелі элементарнага — жыць.

— У Вас практычна няма твораў пра сучаснасць (апроч, бадай, апавяданняў «Бедныя людзі», «Фрузына»). Вы што, інтуітыўна адчувалі немастацкасць часу і свядома адмовіліся выказвацца пра яго мастацкім словам?

— Для мяне час так званага застою, як бы ён ні вызначаўся эканамічна, у экзістэнцыяльных стасунках, сапраўды здаваўся немастацкім. Рэалістычнае мастацтва — выяўленчае ці літаратура — усё ж вымагае пэўнага элементу стыхійнасці, неарганізаванасці, якіх не было ў нашым дашчэнту заарганізаваным, рэгламентаваным бальшавіцкім мінулым. На вайне тае стыхійнасці было куды болей, асабліва ў партызанскай вайне, на акупаванай тэрыторыі, і туды інстынктыўна памкнуліся мае літаратурна-эстэтычныя сімпатыі.

— ...І таму ў дачыненні да сучаснасці Вы абралі не эстэтычны, а — палітычны шлях умяшання ў жыццё. Ці азначае гэта, што літаратуру вызначае ўсё-такі кандыцыя самога жыцця, і жыццё папросту можа не даць спрыяльных імпульсаў для творчасці («крызісны час»)?

— Наколькі наш час лёсавызначальны для нацыі, наколькі драматычны і «праклятыя» для грамадства, настолькі ён неспрыяльны для мастацтва, для функцыянавання культуры. Крызісны час — тым усё сказана. Вядома, пасля ён дасць пэўны плён, можа быць, і плён значны, але — пасля. Як усё ўляжацца, настане нейкая пэўнасць і выразнасць, усталюецца пэўны позірк на мінулае, якім неўзабаве зробіцца наша сучаснае. Выпрацуецца пэўная эстэтыка, адпаведная густам новага часу. Пэўна, на змену ранейшай эстэтыцы, дзе ўсё ж пераважаў рэалізм (крытычны, сацыялістычны) прыйдзе які нечуваны гіпермадэрнізм. Хай! Мае ж літаратурныя густы, што склаліся пад уплывам класічнага рэалізму XIX ст., умацаваліся ў рэчышчы рэалізму XX ст., ад таго не пацерпяць, і не мне ўжо мяняць іх на штосьць нязвыклае. Позна ўжо, ды і не цікава.

— ...І тады мастак — напрыклад, Васіль Быкаў — замяняе пісьменніцкі стол на публіцыстычную трыбуну. Ці азначае гэта, што ў жыцці мастака рана ці позна можа наспець момант, калі палітычная і грамадская дзейнасць стаецца як бы натуральным працягам яго мастацкай, эстэтычнай творчасці?

— Я ніколі не быў палітыкам і не імкнуўся ні ў якую палітыку. І калі я цяпер час ад часу наважваюся нешта сказаць, дык толькі з тае прычыны, што цяжка змоўчаць. Мабыць, гэта ўжо недахоп майго характару — нязручнага, нязграбнага, невыгоднага для сябе характару. Зайздрошчу некаторым таленавітым старэйшым, якія ўмеюць мудра маўчаць. Але што зробіш — сябе не пераробіш. Усё жыццё я імкнуўся да свабоды — у тым ліку і да свабоды асабістай, свабоды распарадзіцца ўласным лёсам, чаго, зрэшты, мне ніколі і не ўдавалася. Ды і ці магло ўдацца? Ці можна ажыццявіць якое з элементарных чалавечых памкненняў у несвабодным і бяспраўным грамадстве?

— Як паставіліся тады, пры канцы 1960-х — у пачатку 70-х, да сітуацыі вакол Вас беларускія пісьменнікі?

— Супраць першых выпадаў у мой адрас выступілі 62 беларускія пісьменнікі, найперш мае сябры — Вярцінскі, Бураўкін... Яны напісалі ліст у маю абарону ў ЦК КПСС. Ён, натуральна, не друкаваўся, але яны здолелі сабраць 62 подпісы. Пасля, вядома, ім дасталося, быў адпаведны працяг, але такая акцыя была... Тады, калі я жыў на Гродзеншчыне, якое б ні праводзілася «мерапрыемства» — гаспартактывы, пленумы абкама, гаркама, райкамаў і г.д., — усе яны зварочваліся на Быкава. Пакідаліся ўбаку жывёлагадоўля і выкананне планаў... Праводзілі паралелі, я быў «ідэалагічным дыверсантам». І гэта ж прадаўжалася не адзін год, гэта цягнулася недзе з 1966-га па 1974 год. Выратоўчым плыцікам, як я ўжо казаў, быў «Новый мир». Твардоўскі пасля першай публікацыі сказаў мне, што ён будзе друкаваць усё, што я ні напішу, у любым жанры. У той час гэта было неверагодна, бо калі нейкі твор тады падпадаў пад партыйную крытыку, то перад аўтарам закрывалася дарога да чытача — найперш у тым выданні, каторае яго надрукавала. Твардоўскі ж і рэдкалегія «Нового мира», наадварот, мяне падтрымалі. Памятаю, мяне моцна пабілі ў «Правде» за «Мёртвым не баліць»... Напісаў наступны твор — там жа надрукаваў, — пабілі яшчэ мацней... Напісаў «Круглянскі мост» — яшчэ мацней узяліся... Уключаліся ўсе выданні — і ў Маскве, і ў рэспубліках, абласцях, раёнах, — пісалі партызаны, героі і г.д., даваліся цэлыя развароты. Тры рэчы былі паддадзены самаму жахліваму астракізму — «Мёртвым не баліць», «Круглянскі мост» і «Праклятая вышыня». З «Сотнікавым» намеціўся нейкі паварот (да таго часу яны прыбралі з «Нового мира» Твардоўскага і расшарсцілі ўсю рэдкалегію). Твардоўскі яшчэ яго падрыхтаваў, прачытаў, але нумар падпісаў ужо новы рэдактар...

— Ці ўзнікалі ў Вас у той час думкі пра эміграцыю?

— Ды не. Па-першае, я быў да таго не гатовы і не думаў пра тое. Мне, прынамсі, пра гэта ніхто не намякаў. Намякалі, наадварот, на фізічную расправу. І такое было, калі нападалі на вуліцах, — крымінальнікі...

— Хто?

— Неяк вечарам мы з Клейнам ішлі па вуліцы, я яго праводзіў. Ля пад'езда яго дома — у цэнтры горада — трохі затрымаліся, заканчваючы размову. І тут на нас наляцелі трое здаровых дзяцюкоў. Пачалі біць. Разбілі акуляры і г.д... Прычым — моўчкі. Мы крычым: «У чым справа, за што!?». А тыя маўчаць. Потым раптам усе адсыпаліся, адзін паварочваецца і кажа: «Простите, ребята». Усё адразу стала зразумела... У міліцыю, параіўшыся, мы не пайшлі, бо адно толькі згубілі б ноч, пішучы тлумачэнні...

— На Вашу думку, вызначаць будзе палітыка, а не культура, расейская ці то беларуская?

— Вот іменна. І вызначаць будзе Лубянка, а не Белы Дом. Лубянка заўсёды вызначыць. Гэта ж зразумела. І тое Лукашэнка зразумеў, чаму ён перамажа Кебіча яшчэ на тых вырабах: Кебіча рыхтавалі Ельцын з Чарнамырдзіным, а Лукашэнку — іншая ўстанова. Заўсёды Лубянка перамагала, як бы яна ні называлася. Нават калі гэта быў запасны варыянт.

— Літаратура і мастацтва ў чарговы раз адступаюць перад напорам самога жыцця?

— У чарговы раз...

— А што цяпер чытаецца?

— Некаторыя рэчы вельмі хараша кладуцца на душу. Гэта тыя, каторыя найменей атаесамляюцца з літаратурай. Вот свядчанні, дакументы. Толькі што прачытаў кнігу Аскоцкага... Вот ляжыць, яшчэ не дачытаў, раман Кастуся Акулы — «Змагарныя дарогі».

— І як ідзе чытанне?

— Гэта — іншае. Я яго не разглядаю як раман, бо для мяне гэта найперш дакумент, сведчанне лёсу, інфармацыя, тут менш за ўсё прэтэнзіі на мастацкасць. І гэта якраз хараша, таму што я пазнаю сутнасць. Усё-такі гэта праблема нашай гісторыі. Тое, што мы называлі калабарацыянізмам і калабарантамі і адпаведна да іх ставіліся, як цяпер бачыцца, было куды больш складаней. Існавалі і калабаранты, і калабарацыя — даволі значныя на Беларусі. Я заўсёды пра гэта гаварыў. Калі ў Беларусі было каля мільёна партызан, і яны ваявалі, дык з кім жа яны ваявалі? Гэта камуністы рабілі такую падмену, што, маўляў, партызаны ваявалі быццам з немцамі. На самай справе якія немцы — у той час як фронт стаяў пад Масквой?.. Немец быў у лепшым выпадку адзін на раён, у раённай адміністрацыі. З кім жа тады ваявалі шматтысячныя партызанскія арміі? Зразумела, з кім — з паліцэйскімі фарміраваннямі, каторыя, як і партызанскія злучэнні, рэкрутаваліся з беларусаў альбо з суседзяў — літоўцаў ці ўкраінцаў. Гэта ж атрымалася абсалютна спантанна — Хатынь. Трагедыю Хатыні спрабавалі аднесці на рахунак немцаў, а папраўдзе яе спаліў канкрэтны 118 украінскі паліцэйскі батальён. Дык вось, што датычыць калабарацыі: прыблізна столькі ж, колькі партызан, было і калабарантаў. І тое, што тут адбывалася, мела ўсе прыкметы грамадзянскай вайны. Нямецкія рэгулярныя войскі ў гэтую справу ўлезлі тады, як фронт падышоў да Полацка. Тады яны акружылі і зліквідавалі ўсю партызанскую зону. «Прарыў» — гэта эўфемізм: разгром быў заменены на «прарыў». Які прарыў? Прарваліся рэшткі...

імкнуўся да свабоды»

Немцы ўмелі гэта рабіць, гэта не Чачня, партызаны для іх не ўяўлялі ніякай небяспекі... Яны іх акружылі і задушылі меней чым за месяц. Рэшткі, каторыя прарваліся з блакады, пасля хаваліся ў Селіцкай пушчы, як я пра гэта пісаў. У густых хвойках яны прывязваліся рамянямі да вершалін і там сядзелі. Ды немцы пусцілі сабак, каторыя аблайвалі дрэвы. Немец падыходзіў і даваў уздоўж ствала некалькі чэргаў... Пасля вайны, у 1947 годзе, калі я праязджаў на радзіму, на тых хвойках яшчэ бялелі партызанскія косці, абглоданыя вараннём... Вот чым мне цікавая кніга Кастуся Акулы. Я адкрываю ў ёй многае, таму што ў часе вайны тут не быў. Я бачу ў гэтым рамане найперш дакумент, сведчанне, хоць і разумею, што ў жыцці нешта магло быць трохі іначай. Тым не менш, калі гэта напісана падрабязна і шчыра, дык шмат што чытаецца між радкоў, у падтэксце.

— Мяне ўразіла, што Вы заўсёды ведаеце, чым скончыцца твор. Ці значыць гэта, што Вы, перад тым, як сесці за стол, «выношваеце» твор?

— Гэта натуральна. Гэта хіба ў шматтомных эпапеях, над каторымі ідзе доўгая, шматгадовая праца, у працэсе якой мяняюцца не толькі сюжэт і характары герояў, але і светапогляд самога аўтара, нельга нешта прадвызначыць. Калі я пачынаю пісаць твор, то ведаю яго канец.

— Гэта падобна на тое, як пішацца паэзія: верш нараджаецца «ўнутрана» і затым заносіцца на паперу.

— Гэтак жа і ў навелістыцы, кароткай прозе.

— Дарэчы, ці захапляецеся паэзіяй, можа, спрабавалі пісаць вершы?

— Не, паэзіяй я не захапляюся. Я люблю кароткія празаічныя рэчы. Для мяне ідэальны верш — тры страфы. Вот чаму, напрыклад, я лічу, што ідэальны гімн для Беларусі — «Магутны Божа». Доўгія рэчы я не люблю. Выключэнне, хіба, толькі «Новая Зямля» Коласа, хоць яе прыцягальнасць, можа быць, не столькі ад паэзіі, колькі ад іншага чагось... У паэзіі і прозе для мяне вельмі важны лаканізм. Ёсць дзве сучасныя школы прозы — нямецкая і французская. Першая, нямецкая, вызначаецца незвычайным шматслоўем; вялікім лаканізмам — другая, французская. Я бачу, што апошнім часам у нас знайшла перайманне нямецкая школа прозы. Пішуць падрабязна і вельмі доўга. І ў нас, і ў расейскай літаратуры таксама.

— Калі ўжо гаварыць пра беларускую літаратуру, то, напэўна, у ёй Вы маеце свае прыхільнасці. Каго б Вы маглі назваць?

— Дасавецкі Купала, безумоўна, вельмі важны. Гэта — апостал беларушчыны, незалежна ад яго пазнейшых паводзінаў. Хоць пасля ён напісаў і фальшывыя рэчы — што ж, мы ж ведаем, як тады было жыць і пісаць — пісаў для паратунку, гэта ж адчуваецца ў радках і між радкоў. Але найбольш важна тое, што ён напісаў раней, з чыстым сэрцам, калі меў натхненне. Тое застанецца назаўсёды. Мы бачым усе яго светапоглядныя ўстаноўкі і грамадзянскія памкненні... Багдановіч, Колас, каторы пражыў больш і, безумоўна, зазнаў эвалюцыю... Можна растлумачыць і бачыць гэтую эвалюцыю.

Самае галоўнае, я лічу, — што творчасць усё-такі павінна быць свабоднай. Калі пясняр свабодны, то ён змагаецца і гаворыць на поўную сілу. А калі ён у нейкім палоне — найбольш у палоне ва ўлады, — то яго творчасць становіцца сумлеўнай. Улада папросту распаўсюджвае яго дэкларацыі — палоннага, — але ўсе яны фальшывыя. Нават калі ён гаворыць «праўду», то яна не можа лічыцца за праўду, бо ён робіць гэта не як свабодны чалавек. Ён робіць гэта, накшталт як закладнікі ААН у Босніі кажуць у інтэрв'ю, што там ім хораша... Яны змушаны гэта казаць, каб ўратаваць жыццё.

— У нашых гутарках, Васіль Уладзіміравіч, не адзін раз узнікалі рэмінісцэнцыі наконт «недаразвітасці народа». Вы як пісьменнік даволі хутка набылі папулярнасць і мелі магчымасць бачыць, як ставіцца да пісьменнікаў за мяжой і ў нас. Ці не было ў Вас шкадавання, што Вы — пісьменнік вось гэтага народа?

— Юрась, я скажу, што для мяне даўно ўжо з'яўляецца праблемай само існаванне «народа»... Асабліва цяпер я пачынаю думаць, што пакуль мы шчыравалі «дзеля народа», кляліся імем народа — у нас яго ўкралі. Засталася нейкая нацыянальная эліта, а нацыянальнай, народнай асновы — не стала. Не стала народа. Я гэта гавару баючыся, як нейкае святатацтва, як у ранейшыя часы гаварылі пра д'ябла і Бога. Але сапраўды, калі мы гаворым «народ, беларускі народ» — то гэта ўвогуле абстракцыя, гэта — па інерцыі. Калі ж канкрэтней паспрабаваць сабе ўявіць: а дзе ён, гэты народ, дзе яго часткі ці хоць бы нейкая значная частка? Раней гэта было проста: існавала сялянства, яно было моўнай, культурнай, генетычнай, этнаграфічнай і г.д. асновай нацыі. Цяпер сялянства няма. Дзе цяпер сялянства? Дажываючыя пенсіянеры-калгаснікі ў вёсках ці элітныя спецыялісты ў сельскай гаспадарцы (аграномы, заатэхнікі і інш.) — хіба яны могуць уважацца за аснову нацыі? Я вельмі ў гэтым сумняваюся... Дык вось калі культурная эліта развівала культуру — для «беларускага народа», — ЗНІК САМ НАРОД. Горад, урбанізаванае насельніцтва гарадоў, — баюся, гэта ўжо не беларускі народ; яно з Беларуссю нічога агульнага не мае, апроч, хіба што, тэрыторыі пражывання. Менск — горад «беларускі» толькі таму, што ён знаходзіцца на тэрыторыі Беларусі, а ў астатнім якая яго адрознасць, скажам, ад Смаленска, Цвяры, Масквы? Чым ён ад іх адрозніваецца?..

— Чым асабіста Вы ратуецеся: пісьмовым сталом, дачай?

— Нічым я не ратуюся. Кідаюся так, туды-сюды, чым жа тут можна ўратавацца — у такі час? Як пісаў адзін разумны расейскі аўтар: «Старость — это одиночная камера знания». У тым, можа быць, і паратунак, — каб ведаць. Сядзець у гэткай «адзіночнай камеры ведання» і ўсё ўспрымаць належным чынам. Гэта найперш.

Для мяне параза на апошніх выбарах (*травень 1995. — Ю.З.*) — таксама вялікі боль і няшчасце, але на мяне як песіміста яна не зрабіла вялікага ўражання. Я не скажу, што яна мяне сакрушыла, разбіла — я да яе быў гатовы, не чакаў нейкай удачы...

Мы ж бачым, які хціўы звер стаіць на заднім плане. Вот Лукашэнка — гэта якраз іх чалавек. Ён так ці інакш будзе сваю справу рабіць; ён будзе рабіць яе датуль, дакуль сваім злом не даканае грамадства, нацыю. Як даканае нацыю, як нацыя стане перад выбарам: або загінуць фізічна, або выжыць і змяніць сістэму, — тады ён будзе таксама адпрэчаны.

...Час Адраджэння яшчэ не наспеў. Яшчэ толькі мы недзе робім першыя спробы, яшчэ на падступах да гэтага. І дапаможа нам у гэтым, як ні дзіўна, — Лукашэнка. З яго радыкалізмамі і фашыстоўскімі замашкамі. Ён падштурхне. Гэта той выпадак, калі, сапраўды, «чым горш, тым лепш». Гэта не значыць, канешне, што я за тое, каб ён паспяхова кіраваў: ён не можа паспяхова кіраваць; але ён вымушаны кіраваць такім чынам, таму што ён не свабодны. Ён выконвае дырэктывы і тэндэнцыі пэўных органаў, найперш расейскіх. Але скончыць ён вельмі кепска... Пэўны стан эканомікі яго ўзнёс, і гэтая ж эканоміка яго нізвергне, таму што ён з ёю не зладзіць. Зрэшты, з гэтай эканомікай не зладзіць ніхто, я ўжо гаварыў ні адзін раз. Ні Гасподзь Бог, ні анёлы не могуць упарадкаваць гэтую эканоміку, паколькі яна — параджэнне нячыстай сілы. Яна павінна памерці, пертварыцца ў тло, глебу, з якой народзіцца новая эканоміка, якая, я не ведаю, але яна павінна нарадзіцца. Нельга ж эканоміку ствараць указамі ці дэкрэтамі. Яна — жывы арганізм чалавечага існавання. І ён павінен марудна вырасці, як вырастаюць дзіця, кветка, расліна. Каб нармальна функцыянаваць у інтэрэсах людзей, нешта павінна вырасці натуральным чынам. А на глебе атручанай сацыялістычнай эканомікі такая кветка вырасці не можа...

— Баюся, Васіль Уладзіміравіч, што каб пераадолець спадчыну сацыялізму, — тут чалавек, мусіць, не здольны нешта выправіць; тут, відаць, без другога прышэсця не абысціся...

— Можа, і так. На гэты конт я цёмны чалавек. Я не ведаю, не магу нічога прадбачыць. Як не можа прадбачыць ніхто, хоць людзі заўсёды вызначалі пэўны накірунак. Аднак усе тыя «вызначальнікі» вельмі хутка банкрутавалі. Сёння сумленны чалавек можа толькі развесці рукамі, а калі нехта паказвае, куды «трэба» ісці, то гэта альбо авантурыст, каторы робіць тое ў карыслівых мэтах, альбо проста недалёкія людзі, каторым здаецца, што яны нешта ведаюць. На самай справе ўсё гэта вельмі цьмяна, таму што, па-першае, чалавек сам сябе не ведае, а па-другое, ён зменлівы... Здаецца, Пазаліні ці Антаніёні, нехта з іх, зняў фільм на антычную тэму, нешта з жыцця Нерона. Пасля ў рэжысёра спыталіся, што самае цяжкае: аднавіць дэкарацыі тагачаснага жыцця ці рэканструяваць псіхалогію антычнага чалавека. Ён адказаў, што самае цяжкае — аднавіць псіхалогію, таму што псіхалогія зменлівая. У мастацтве гэта ўвогуле амаль немагчыма. Элементарны прыклад, каторы прыходзіць на памяць: Сенека. Яму імператар выказаў сваё незадавальненне. Што зрабіў Сенека? Пайшоў змагацца супраць імператара? Не, ён пайшоў дамоў і выпіў цыкуту — ад таго, бачыце, што імператар яго разлюбіў...

— Сёння мы кажам пра расслаенне нацыі; дык ці можа быць у такіх умовах універсальнай каштоўнасцю «здаровы сэнс»?

— «Здаровы сэнс» сёння нацыяй страчаны, і гэта прыкра...

— Нават у палякаў, якія, па сутнасці, распачалі змаганне з камунізмам у сацыялістычным лагеры — пры канцы 70-х, — зараз няма агульнанацыянальнага лідэра. Былыя камуністы цягнуць за сабой ладную частку грамадства...

— Таму што дыферэнцыяцыя грамадства адбылася. У цэнтральнаеўрапейскіх дзяржавах былі свае супярэчнасці, але раней іх нацыі былі нечым з'яднаныя больш, чым цяпер, скажам, тая ж Польшча. Вот калі туды прыйшлі камуністы, дык, натуральна, яны перш за ўсё выкарысталі ўсе сродкі, каб нацыю расхалоць на кавалкі. Таму што толькі ў такім стане яны здольныя ўтрымліваць уладу. І яны за пяцьдзясят гадоў гэта зрабілі. А да камуністаў нацыя была з'яднаная. Нават немцы, акупаваўшы Польшчу, не змаглі (ці не схацелі, як часам кажуць) стварыць там масавую калабарацыю і ўгоднае самакіраўніцтва. Гэта ж пра многае сведчыць. Праўда, там былі касцёл, рэлігія, што аб'ядноўвалі нацыю. А ў нас нават і рэлігія не можа аб'яднаць, таму што ва ўмовах дзвюхканфесійнасці якое можа быць аб'яднанне? Ды яшчэ драбленне па сацыяльным стане, нацыянальнай прыналежнасці, іншае...

— Камунізм захапіў Беларусь суцэльна...

— Ён, камунізм, увесь час імкнуўся трымаць народ у нейкім маналітным лагеры, не зважаючы на нацыянальнасці. Было адно вялікае дзяленне на камуністаў і беспартыйных (як у Афрыцы — на белых і чорных). У той час як камуністы валодалі ўсімі правамі і магчымасцямі, беспартыйныя не валодалі і іх палавінай... Ідэалагічны таталітарызм выхоўваўся ці не з дзіцячага садка — акцябраты, піянеры, камсамольцы... Гэта былі, па сутнасці, сапраўдныя дзяржаўныя секты, з іх унутранай ідэалогіяй і дысцыплінай. Тое было ў інтарэсах дзяржавы і партыйнага кіраўніцтва...

— Але зноў-такі, за апошнія дзесяць гадоў «галоснасці» столькі напісана пра рэпрэсіі, ГУЛАГ, што дзіву даешся, як грамадства — «самае чытэльнае» — не баіцца паўтору таго, што было пры савецкай уладзе — вынікі апошніх выбараў сведчаць пра тое... Чаму ж людзі нічога не баяцца?

— Яны нічога не баяцца, таму што грамадства па-ранейшаму застаецца неінфармаваным. Як вядома, на пачатку перабудовы гучала шмат патрабаванняў (з боку расейскіх дэмакратаў), каб кампартыя пакаялася ў злачынствах, адмовілася ад свайго злачыннага мінулага. Гэтага не было зроблена. Усе хрушчоўскія выкрыванні сталінізму былі частковымі, бо пералічваліся толькі імёны рэпрэсаваных маршалаў і кіраўнікоў, а пра народ — маўчалі. Таму ў масавай свядомасці рэпрэсіі так і засталіся рэпрэсіямі кіраўніцтва супраць кіраўніцтва, а не ўлады супраць народа...

Колькі Алесь Адамовіч заклікаў «дадумваць да канца»! А ў нас гэта ніяк не дадумана. Канцы і пачаткі нашай бяды дзесьці ў Кастрычніцкай рэвалюцыі, а можа, і яшчэ раней... І прычына нашай галоты не ў «разбурэнні сувязяў паміж прадпрыемствамі», а ў тым, што ў 1917 годзе адбылася жахлівая рэвалюцыя, і Расія, разам з нацыянальнымі ўскрайкамі, улучна з Беларуссю, пайшла не ў тым кірунку. Мы пайшлі абсалютна ў тупіковую галіну і ўперліся ўрэшце ў тупік. І цяпер як вярнуцца назад? Гістарычны час гэта выключае. Як зноў збочыць у агульнае русла зямной цывілізацыі — не ведае ніхто... Вот таму гэта ўсё мы і перажываем. І павінны перажыць. У гэтым сэнсе самае жахлівае — разбурэнне найбольш агульнага, боскага прынцыпу прыватнай уласнасці. З яго ўсё пачынаецца. Калі прыватную уласнасць панішчылі, панішчылася ўсё... Бо чалавек ад жывёлы адрозніваецца тым, што здольны нечым валодаць і распараджацца. Нават леў, сабака «мецяць» сваю тэрыторыю, свае ўладанні... Прырода толькі тады дасць нейкі плён, калі яна будзе камусьці належыць. А ў нас праца людзей і ўласнасць не толькі абяздушаны, але і незаконным чынам прысвоены, можна сказаць, антылюдзьмі, нечалавекамі. Пры сацыялізме ўласнасцю народа распараджалася Палітбюро, купка людзей. З гэтага пачаліся ўсе няшчасці... І таму, каб вярнуцца ў ранейшае становішча, уласнасць трэба раздаць канкрэтным людзям. Толькі як гэта зрабіць па справядлівасці? Ёсць жа ў матэматыцы задачы, якія не маюць рашэння. Баюся, што такая ж праблема зараз у нас з уласнасцю: яна не мае свайго справядлівага вырашэння — вот у чым нявыкрутка...

Юрась ЗАЛОСКА

Ганна КОМАР: «Калі б кáты чыталі кніжкі, яны б не былі такімі»

« Заканчэнне. Пачатак на стар. 7 (1) »


Фота Кацярыны Шараг

А яшчэ ад жанчын чакаюць, што яны будуць добра выглядаць і мець нейкія сілы на ўласныя амбіцыі. Прытым я ні ў якім разе не супраць, калі жанчына становіцца хатняй гаспадыняй па ўласным жаданні. Фішка ж фемінізму не ў тым, каб усе рабілі адно і тое ж, а каб усе займаліся тым, што ім бліжэй. Дарэчы, феміністкай я стала, як ні дзіўна, пад уплывам мужчыны. Майго былога партнёра-прафімініста, ірландца Марка (смяецца). Мне так смешна і трошкі сорамна гэта ўзгадваць: я, аказваецца, і расісткай яшчэ была. Мы, беларусы, насамрэч няхілыя расісты: у нашым грамадстве даволі распаўсюджаны анекдоты пра нацыянальнасці, напрыклад. Я калісьці думала, што жарты пра габрэяў — гэта проста жарты. Я ж не ненавіджу іх, увогуле ніякіх прэтэнзій да іх не маю, проста паўтараю дурацкія жарты. І вось аднойчы Марк акуратна мне кажа: «Ты разумееш, што гэта расізм?»...

Я ўжо тады была актывісткай, мела шмат замежных знаёмых. Тэма правоў чалавека стала раскрывацца, зразумела, што ад усіх гэтых зняважлівых выказванняў, нават у анекдотах, трэба пазбаўляцца. Туды ж дадаўся і сэксізм. Тады яшчэ маладзейшая была, думала, што феміністкі ненавідзяць усіх мужчын. Такое прымітыўнае бачанне. Дзякуючы Марку і камунікацыі з іншымі людзьмі паціху я стала і феміністкай. Фемінізм — гэта не пра нянавісць да мужчын, а пра роўныя магчымасці для ўсіх.

— А калі ідзеш на спатканне, ты плаціш за сваю каву?

— Залежыць (усміхаецца). М-м-м-м, калі апошні раз я на спатканне хадзіла... Па-першае, я так рэдка хаджу на спатканні, што такой праблемы ў мяне амаль не ўзнікае. Апошнім разам было так: хлопец запрасіў мяне на абед і заплаціў. Я не была супраць, ды і было бачна, што для яго гэта натуральна. А другі раз я запрасіла яго ў кіно і купіла нам квіткі. Ён хацеў аддаць грошы, але я сказала: «Не, не трэба, я цябе запрашала». Гэта вельмі прыемнае пачуццё, калі сама магу за сябе заплаціць. Але бываюць розныя сітуацыі, напрыклад, мне «не па кішэні». І каб усе ўсё разумелі, магу адразу запытаць: «Давай удакладнім: мы плацім разам ці паасобку?». Альбо кажу: «Я хацела б сама за сябе заплаціць». І чалавек: «Не-е-е, ты што!». Ці: «Ок». Некаторых гэта крыўдзіць, мне падаецца, нават трохі палохае больш кансерватыўных мужчын. Ну, тады нам не па дарозе... Калі я не пасую табе, то ты не пасуеш мне. Правільна? Але ёсць сябры, якія плацяць за мяне. Спакойна да гэтага стаўлюся, бо яны могуць і хочуць, для іх гэта спосаб паклапаціцца пра мяне. Я ж таксама дапамагаю людзям. Вось так гэта працуе, вайны ніякай няма.

— Ты калісьці ездзіла па праграме ў Ірландыю на год. І ў пэўным сэнсе, мне здаецца, Ірландыя мáе падабенствы з Беларуссю: гістарычныя і культурныя. Чым мы падобныя з ірландцамі?

— Насамрэч многія былыя калоніі падобныя: іх прыгняталі, знішчалі аўтэнтычную культуру, мову. Існуе ж ірландская мова, але размаўляюць амаль усе па-англійску. І, чула, што тое, як выкладаюць ірландскую ў школах, не выклікае ахвоту яе вучыць. Руская і беларуская з адной моўнай сям'і, яны падобныя. І нават калі ты не можаш размаўляць па-беларуску, хутчэй за ўсё ты яе хаця б мінімальна зразумееш. А ірландская абсалютна адрозніваецца ад англійскай, па гучанні нават болей падобная да арабскай, мне так падалося. Таму яшчэ цяжэй. Хаця ў крамах усё на дзвюх мовах.

Чытала кнігу ірландскага аўтара пра тое, як на мове адбіваецца ландшафт. Ірландыя ж камяністая, скалы, цэлыя палі плоскіх пліт, вятры, камяністыя берагі, акіян і мора, халодныя нават летам. Гэльская мова сапраўды гэта перадае.

Ірландцы таксама ў розныя часы шмат эміgравалі. У ЗША, Аўстралію і г.д. Вельмі чакаю, што агульным для нашых краінаў будзе і масавае вяртанне. Ірландыя — моцна каталіцкая, нягледзячы на тое, што гэта адна з нешматлікіх краін, дзе легалізаваны аднаплыя шлюбы, там былі забароненыя аборты. Ірландцы доўга змагаліся за адмену гэтай папраўкі, і вось два гады таму нарэшце дамагліся галасавання. Прыляталі з усяго свету, каб выкарыстаць сваё права голасу. Вельмі хацелася б, каб аднойчы беларусы з усяго свету прыляцелі, каб прагаласаваць на справядлівых выбарах!

Ну і яны многа п'юць. Збольшага, гэта ўсё, пра што магу падумаць. Карацей, агульнае ў нас — траўмы посткаланіяльнай краіны. Але мы больш ціхія, ірландцы вельмі шумныя. Як мне патлумачылі, гэта шум, якім яны спрабуюць заглушыць унутраную глыбокую тугу. Яны вельмі раскідана жывуць — горы, узгоркі. Адзінота. Раней яшчэ і гарады былі меншыя. Плюс надвор'е: шмат дажджоў, ветру, мала сонечных дзён. Цяжкая праца. П'еш і гучна сябе паводзіш — каб проста заглушыць гэтую тугу, экзістэнцыйны боль. І, можа, экзістэнцыйнай тугой мы падобныя.

Яны таксама хітра абыходзяцца з англійскай. Інкарпаруюць туды ірландскія канструкцыі. Як у нас,: быццам бы гаворыш па-руску, але ўжываеш «шуфлядка», «жменька», «тудой», «ссабойка», «байка» і г.д. У іх таксама ёсць пэўныя хітрыкі — напрыклад, ірландскія сінтаксічныя пабудовы сказа. Яны могуць ужыць няправільны для брытанскай англійскай прыназоўнік: замест «to have money with me» — «to have money on me». Таму што так у ірландскай.

— Гэта, як у нас «смяяцца з чагосьці», і гэты прыназоўнік цягнуць і ў рускую.

— Так! «Чего ты с меня смеёшся?» Такі хітры, партызанскі спосаб мове выжыць. Яшчэ ў Ірландыі значна вышэйшы ўзровень жыцця. А ў 1990-я краіна была вельмі бедная. У нас кантэкст іншы — СССР... А ў іх пайшло-паехала, цяпер Ірландыя — вельмі дарагая краіна. Дарэчы, тэхналогіі на высокім узроўні, падчас пандэміі нават эканамічна падняліся за кошт айці-сектара.

— Чытала, у цябе было сумоўе для брытанскай адукацыйнай праграмы Chevening.

— Гэта стыпендыя брытанскага ўрада. Яна даецца для атрымання магістарскай ступені лідарам у сваёй сферы, розных узростаў і з розных краінаў. Я падалася ў тры брытанскія ўніверсітэты, ва ўсе паступіла. Адзін у Лондане, праграма ад Вэстмінстара, прыгожае пісьменства — як пісаць пра горад у розных жанрах. Другі варыянт — культура і літаратура посткаланіяльных краін — у Лідсе. Трэці — прыгожае пісьменства з ухілам на паэзію — у Эдынбургу. Ну, чакаю, ці дадуць стыпендыю, бо ўсё там вельмі дорага. Спачатку думала пачакаць, калі на радзіме справы наладзяцца, але развіццё — працэс доўгі. Сітуацыя ў Беларусі можа расцягнуцца на месяцы і гады. Трэба разумець, што я гэта раблю не толькі для сябе. Чым больш нас разбураюць, тым больш круцейшыя мы павінны быць, атрымаць адукацыю і вярнуцца ў Беларусь. Не даць сябе разбурыць. Не даць сябе аслабіць. Я кажу такім камандным тонам, бо мяне, бывае, заносіць — трэба, як я. (смяецца). У мяне ёсць свае «правільныя правілы», якімі ўсе мусяць кіравацца (смяецца).

І да таго ж даўно нікуды не выязджала, а для мяне гэта крытычна важна. У замкнёнай прасторы няма адкуль браць сілы. Ну, я захрасла. І што я магу рабіць, калі ў мяне няма рэсурсу, захрасла ў гэтым ладзе жыцця, у сваіх перажываннях. І тое, што я паеду, гэта ж не азначае, што нічога не буду рабіць для Беларусі. Увогуле, рана казаць, на гэтую стыпендыю вялікая канкурэнцыя. Усё атрымаецца найлепшым чынам, часам атрымаць адмову аказваецца лепш.

— Ты была ініцыяторкай выхаду зборніка перакладаў паэзіі Чарлза Букоўскі. Напачатку кнігі там маленькае інтэрв'ю. Журналіст пытае ў Букоўскі: «Цяпер банальнае пытанне: хто найвялікшы з жывых паэтаў?». А як ты думаеш?

— Не, я такімі катэгорыямі не мыслю. Столькі важных і вялікіх вершаў. Я проста не разумею гэтага пытання. Табе скажуць: гэта найвялікшы паэт. І што? Прачытаеш усе яго кніжкі і будзеш спадзявацца, што жыццё тваё пасля гэтага зменіцца?

— Можа, хтосьці ўбачыць гэтае імя ў інтэрв'ю і захоча пачытаць таго аўтара...

— Тады можна параіць паэтаў. Але я не люблю выбіраць кагосьці аднаго. Усе, хто стаяць у мяне на паліцы, крутыя. Віслава Шымборска, Эва Ліпска, Богдан Задура... У такім парадку стаіць: спачатку польскія аўтары ў беларускім перакладзе (усміхаецца). Нашыя беларусы Наста Кудасава, Вальжына Морт, Артур Камароўскі, Крысціна Бандурына, Андрэй Хадановіч, Марыя Мартысевіч, Юля Цімафеева, Віталь Рыжкоў — усе крутыя. Англамоўныя зборнікі — не магу выбраць нават аўтара. У аднаго паэта адно падабаецца, у другога — іншае. Чытаеш верш, трапляе радок — і гэта чысты кайф.

— Ну тады на фінал: якое пытанне ты хацела б, каб табе задалі, але гэтага чамусьці не адбываецца?

— Блін, вось, бывае, узнікае думка: «Ну чаму пытаюць адно і тое ж, а што цікава — не». А цяпер паспрабуй прыдумай (усміхаецца). Хм... (думае). Ёсць пытанні, ад якіх мне страшна, якія я б не хацела, каб мне задавалі (смяецца).

— Якія, напрыклад?

— (Смяецца.) Ці верыце вы ў тое, што літаратура здольная змяніць свет да лепшага?

— Таму што невядома, які адказ? Ці ад таго, што вядома?

— Не хацела б сеяць песімізм, але не магу цяпер натхніць і адназначна сказаць: «Безумоўна, літаратура змяняе людзей». Таму што літаратура не можа спыніць злачынцаў, а я б вельмі хацела, каб яна магла. Калі б кáты чыталі кніжкі, яны б не былі такімі. Каб яны ўмелі чытаць кніжкі. То-бок сама па сабе толькі сваім фактам існавання літаратура не можа нешта змяніць.

М-м-м-м, якое пытанне я хацела б, каб мне задалі... Вялікая доўгая паўза (усміхаецца). Я ў такім нерэсурсным стане, шчыра кажучы, што і не ведаю нават. Ці будзеш ты яшчэ пісаць вершы пра каханне? (Усміхаецца.) Вось яно, можна колькі заўгодна разважаць пра філасофію, а каханне ўсё адно ўсплывае. Як бы я ні была занятая грамадска-палітычнай актыўнасцю і творчасцю, патрэба ў каханні недзе заўжды побач, асабліва ў моманты цішыні.

— Дык што, чакаць вершы пра каханне? (У гэты самы момант за суседнім столікам хлопец цягнецца да дзяўчыны, каб пацалаваць.)

— Вось гэта сінхранізацыя (шэптам). Ці чакаць вершы пра каханне? (Маўчыць.) Думаю, што так. Вельмі спадзяюся, што пра шчаслівае, не хачу ўжо пісаць пра іншае. Столькі ўжо напісала і перажыла. Можа, напішу аднойчы, якім паэтычным можа быць зямное каханне, без драм, без рамантычных ілюзій, неўтаймаванай жарсці, сузалежніцкай хваравітасці. Яшчэ не гублю надзеі перажыць такое каханне.

Ганна Варонка

Літаратурная Беларусь
Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА.
Тэлефон для даведак: (8-017) 354-80-91. Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by